16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 45 (5202) 11 лістапада 2022 г.

ISSN 0024-4686

Блізкі сучасніку Колас стар. 5

Узвысіць чалавечую годнасць стар. 12

«Харошкі» на хвалі з Купалам стар. 13

# Палітра лістапада

Фота БелТА.

Падчас адкрыцця фестывалю.

Апошнім часам у стужцы беларускіх кінанавін запанавала зацішша: цікавых вестак з кожным месяцам меншае. А ўсё ж апладысменты гучаць! На кароткі час Беларусь стала ні многа, ні мала цэнтрам кінамастацтва: гэтымі днямі на экранах нашай краіны — фестывальныя хіты з усяго свету. Амаль паўтары тысячы заявак з 89 краін, каля сотні кінафільмаў у больш чым 30 гарадах і безліч розных мерапрыемстваў... Маршам па кінатэатрах сталіцы і ўсёй рэспублікі прайшоўся XXVIII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад»!

Пачаўшыся з урачыстай цырымоніі адкрыцця і сімвалічнага абраду разбівання талеркі ў мінулую пятніцу, сёння «Лістапад» падводзіць свае вынікі. У 18.00 у сталічным кінатэатры «Масква» — цырымонія закрыцця фестывалю, падчас якой будуць вызначаны фаварыты журы ў чатырох конкурсных праграмах, лаўрэаты спецыяльных узнагарод кінаспаборніцтва, а таксама ўладальнікі прызоў сімпатый гледачоў. Зрэшты, прамежкавыя вынікі падведзены ўжо. Так, яшчэ ў панядзелак завяршыўся конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік».

Працяг тэмы на стар. 4 ►

## «ЛіМ»-акцэнты

**Віншаванне.** Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў суайчыннікаў з чарговай гадавінай Кастрычніцкай рэвалюцыі. «Гэтая падзея азнаменавала пачатак новай эпохі ў гісторыі беларускага народа, які атрымаў шанц стварыць на роднай зямлі нацыянальную дзяржаву, стаць паўнацэнным суб'ектам міжнародных адносін. Кастрычнік 1917 года ўвасобіў мары мільёнаў працоўных свету аб пабудове справядлівага грамадства на прынцыпах народаўладдзя, узаемнай сацыяльнай адказнасці і гуманізму», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь захавала дасягненні савецкай эпохі, прымнажаючы іх здзяйсненнямі суверэннага перыяду. «Мы беражом памяць аб трагічных падзеях мінулага, увекавечваем перамогі і імёны герояў тысячагадовай гісторыі беларускага народа, прыклады мужнасці і мудрасці якога дапамагаюць нам пераадольваць выклікі, будаваць надзейны фундамент будучыні», — адзначыў беларускі лідар.

**Фестываль.** У VIII Рэспубліканскім фестывалі нацыянальнай драматургіі імя В. Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску прымаюць удзел адзінаццаць тэатраў з сямі гарадоў Беларусі. Фэст, які праходзіць з 11 да 16 лістапада, уключае дзве конкурсныя праграмы: «Спектакль тэатра драмы» і «Эксперымент». Як інфармуе БелТА, удзельнічаюць тэатры з Брэста, Віцебска, Гомеля, Маладзечна, Бабруйска, Магілёва і Мінска. Яго рыхтавалі доўга, адборы праходзілі яшчэ ў 2021 годзе, але па розных прычынах, у тым ліку звязаных з эпідэміялагічнай сітуацыяй, ён быў перанесены на 2022 год. Спектаклі, якія былі адабраны, захаваліся ў праграме. Таксама з'явіліся дзве новыя пастаноўкі: Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача і Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча.

**Вернісаж.** Выстаўка «Меер Аксельрод. Успамін пра Менск», прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння мастака і 955-годдзю Мінска, працуе ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. Спадчына творцы належыць гісторыі яўрэйскага, беларускага і расійскага мастацтва. «Выстаўка "Меер Аксельрод. Успамін пра Менск" нібыта адкрывае нам дзверы ў горад, які ў час стварэння малюнкаў меў назву Менск на чатырох дзяржаўных мовах, сярод якіх была ідыш. Усе работы захоўваюцца ў прыватнай калекцыі і экспануюцца ўпершыню. Сёння яны маюць не толькі мастацкую, але і гістарычную, дакументальную каштоўнасць, успрымаюцца як помнік страчанаму старасвецкаму выгляду беларускай сталіцы, які добра ведаў і любіў Янка Купала», — расказалі ў музеі. Наведаць выстаўку можна да 3 снежня.

**Юбілей.** Беларускі саюз кінематаграфістаў адзначыў 60-годдзе. Урачыстая цырымонія адбылася ў Тэатры-студыі кінаакцёра, гаворыцца на сайце Міністэрства культуры. На цырымонію ў глядзельнай зале тэатра сабралася шмат гасцей: ветэранаў кіно, пачынаючых і дзеючых кінематаграфістаў. У пачатку ўрачыстасці прайшоў паказ фільма, прысвечанага гісторыі Беларускага саюза кінематаграфістаў. У хроніцы сустрэліся адразу некалькі пакаленняў. Аўтарам карціны выступіў Кірыл Халецкі, які стварыў гэты праект пад кіраўніцтвам беларускага рэжысёра Алены Туравай. У кадры — сцэнарыст Ізольда Кавелашвілі, стваральніца «Лістапада» Валянціна Сцяпанава, аператар і рэжысёр Дзмітрый Зайцаў, актрыса Таццяна Мархель і іншыя. Героі дакументальнай стужкі расказалі аб тым, як стараўся саюз кінематаграфістаў і якую ролю ён адыграў у іх жыцці.

**Праект.** У зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі экспануецца юбілейная выстаўка «Пясняр азёрнага краю», прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння беларускага паэта, празаіка, драматурга, перакладчыка Міхася Машары. Як паведамляецца на сайце кніжніцы, увазе наведвальнікаў прадстаўлена трылогія, прысвечаная вызваленчаму руху Заходняй Беларусі, куды ўвайшлі раманы «Крэсы змагаюцца» (1966), «Сонца за кратамі» (1968), «Лукішкі» (1970), а таксама раманы «Ішоў дваццаты год» (1973), «І прыйдзе час…» (1975) і кніга ўспамінаў пісьменніка «Старонкі летапісу» (1975). На паліцах размешчаны паэтычныя зборнікі («Малюнкі» (1928), «З-пад стрэх саламяных» (1937), «Беларусі» (1944) і іншыя) і кнігі для дзяцей. Дапаўняюць экспазіцыю зборнікі і перыядычныя выданні, якія ўключаюць аўтарскія творы, а таксама ноты з вершамі Міхася Машары, да якіх была напісана музыка кампазітарамі Мікалаем Аладавым, Рыгорам Пукстам, Юрыем Семянякам і іншымі. Экспануюцца і матэрыялы аб жыцці і творчасці юбіляра. Экспазіцыя прадоўжыцца да 5 снежня.

**Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**

## у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

# Да госці

НАВІНЫ ПАНЯДЗЕЛАК

**У беларускіх пісьменні[illegible] ны з расійскім літар[illegible] «Александръ». В[illegible] кладзе на р[illegible] і празаік[illegible] нак, Міхас[illegible]**

Зусім нядаўн[illegible] цалкам прысвеча[illegible] «беларускага нум[illegible] пада ў Мемарыяль[illegible]

[illegible]адзіне. У госці прыедзе рэдакцыя расійскага вы[illegible]ня. Да прэзентацыі будзе прымеркавана і выстаўка кніжных, часопісных, газетных публікацый твораў расійскіх аўтараў, якія ў апошнія гады пабачылі свет у перакладзе на беларускую мову.

— Ужо рыхтуецца наступны «беларускі выпуск» часопіса «Александръ», — зазначае паэтэса Іна Фралова. — Спадзяюся, што гэты праект прынясе свой немалы плён у развіцці беларуска-расійскіх літаратурных сувязей.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

# Лірыка па-гомельску

■ У Гомельскай Ірынінскай гімназіі прайшоў конкурс чытальнікаў «Восеньская літаратурная гасцёўня. Бацькоўскі дом — пачатак усяму!». Выразнасць чытання мастацкіх твораў ацэньвала кампетэнтнае журы на чале з членам Гомельскага абласнога аддзялення СПБ Аляксандрам Джадам (Дэйчам). У камандзе пісьменніка былі педагогі-ветэраны Ірынінскай гімназіі. Самыя лепшыя чытальнікі атрымалі спецыяльныя дыпломы і кнігі.

■ Перасоўная фотавыстаўка «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» працуе ў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэцы імя У. І. Леніна. Гэта адзін з праектаў у праграме галоўнай кніжніцы краіны да 100-годдзя з дня заснавання. У адкрыцці фотавыстаўкі прынялі ўдзел старшыня Гомельскага абласнога аддзялення СПБ Уладзімір Гаўрыловіч і яго калегі.

■ У рамках праекта па літаратурным краязнаўстве «Літаратурная карта Гомеля» ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. І. Герцэна адбылася творчая сустрэча з пісьменніцай Інай Зарэцкай. У кніжніцу завіталі і вучні пачатковых класаў Гімназіі № 10, якія выканалі сцэнку па матывах твораў са зборніка «Знаёмства з зайчанём». Іна Іванаўна пазнаёміла дзяцей са сваімі кнігамі, прачытала вершы і апавяданні з іх.

*На сустрэчы з Інай Зарэцкай.*

■ У Год гістарычнай памяці партнёр абласнога аддзялення СПБ Гомельская абласная ўніверсальная бібліятэка імя У. І. Леніна правяла паэтычны анлайн-марафон «Свята белых жураўлёў», прысвечаны памяці воінаў, якія загінулі на палях бітваў. У анлайн-марафоне прынялі ўдзел ўсе ахвотныя аўтары. Асаблівую актыўнасць праявілі навучэнцы прафесійнага ліцэя рачнога флоту і супрацоўнікі ўстановы культуры. Сярод актывістаў марафону — паэт, празаік, публіцыст Алег Ананьеў. На сайце абласной бібліятэкі увазе чытачоў прапанаваны відэа чытання вершаў пра вайну і несмяротны подзвіг абаронцаў Радзімы.

**Улад ПРЫАЗЁРНЫ**
**Фота даслана аўтарам**

## імпрэзы

# Куды імкнуўся пясняр

**Калі пытаеш у навучэнцаў, якіх беларускіх паэтаў яны ведаюць, то адразу чуеш імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа. Сапраўды, яны ўвайшлі ў свядомасць кожнага беларуса змалку і засталіся на ўсё жыццё. Гэта сімвалы не толькі беларускай літаратуры, але і Беларусі ўвогуле. Сваёй дзейнасцю і творчасцю яны заслужылі права быць сімваламі нацыі. Сёлета ім — асаблівая ўвага, бо мы адзначаем 140-годдзе з дня нараджэння славутых песняроў беларускай зямлі.**

Улетку прайшлі мерапрыемствы па ўшанаванні памяці Янкі Купалы, увосень праходзяць святы ў гонар Якуба Коласа. У Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеі адбыліся Каласавіны. Каласавіны на Пухавіччыне — не разавая акцыя, а традыцыйнае свята, якое адзначаецца штогод, проста ў юбілейны год набывае іншы маштаб. Гэта невыпадкова: Якуб Колас лічыў Пухавіцкі край другой малой радзімай. Ён правёў тут шмат шчаслівых момантаў, напісаў шэраг цікавых і захапляльных твораў, пакінуў запамінальны след у гісторыі Пухавіцкага раёна. З 1930-х гадоў і да апошніх дзён жыцця рэгулярна прыязджаў на адпачынак, гасцяваў з сям'ёй у розных паселішчах. Вёскі Талька, Загібелька, Падбярэжжа, Вусце, Беразянка, Балачанка паўстаюць у паэтычных і празаічных радках класіка. У Коласаўскіх радках: «Я мімаволі ўспамінаю // І ў той куток імкнуся зноў // Дзе жыў я ціха, як у раі…» — адчуваюцца пранікнёныя адносіны да Пухавіччыны.

А нашчадкі — жыхары Пухавіцкага раёна ўдзячны за тое, што паэт разглядзеў прыгажосць менавіта гэтых мясцін, імкнуўся сюды, каб напоўніць душу жывільнымі перажываннямі. Напоўніць сэрцы падобнымі эмоцыямі, дакрануўшыся да постаці класіка беларускай літаратуры, кожны дзень можна ў мастацкай галерэі Пухавіцкага краязнаўчага музея, дзе афармлена экспазіцыя «Людзі і прырода краю. Якуб Колас і Пухавіччына».

Супрацоўнікі музея падрыхтаваліся да юбілею. Экспазіцыя папоўнілася новымі выстаўкамі. На адной з іх прадстаўлена кніжная спадчына паэта, на другой — фотаздымкі пухаўчан і пухавіцкіх краявідаў, перададзеныя малодшым сынам Якуба Коласа Міхасём Канстанцінавічам.

Атмасферна афармлілі залу, дзе праходзіла мерапрыемства. Хочацца сказаць, што яно было ўрачыстым, але гэта будзе не зусім дакладна. Панавала добрая свойскасць, сямейнасць, роднасць.

У цёплай абстаноўцы сустрэліся прыхільнікі творчасці Якуба Коласа розных пакаленняў. Было шмат настаўнікаў і вучняў школ Пухавіцкага раёна. Слова класіка паяднала ўсіх! Школьнікі і навучэнцы Мар'інагорскага аграрна-тэхнічнага каледжа прадставілі малюнкі да твораў пісьменніка, а супрацоўнікі музея афармілі з іх прыгожую выстаўку.

Склалі праграму, улічыўшы жаданні гасцей прачытаць вершы і ўрыўкі з твораў любімага паэта. Старшы навуковы супрацоўнік Аляксандр Прановіч падзяліўся з удзельнікамі свята ўнікальнымі фактамі з пухавіцкага жыцця Якуба Коласа, пра якія не прачытаеш у падручніках. Супрацоўнікі раённай бібліятэкі таксама афармілі выстаўку, а асаблівую цікавасць выклікалі іх творчыя заданні пра жыццё і дзейнасць Якуба Коласа на Пухавіччыне. Дырэктар музея Таццяна Прысяжнюк так душэўна сустрэла кожнага госця і ўдзельніка мерапрыемства, што, нават калі ўсё скончылася, не хацелася разыходзіцца. Асабліва пранікнёныя словы з яе вуснаў прагучалі ў адрас дзетак, якія прымалі ўдзел у конкурсе чытальнікаў твораў беларускага класіка.

Прагучала каля трыццаці вершаў паэта, шмат з якіх былі напісаны на пухавіцкай зямлі ці ёй прысвечаны. На памяць канкурсанты атрымалі падарункі — сертыфікаты ўдзельнікаў, дыпломы пераможцаў, кнігі з памятнымі надпісамі.

**Алена СВІРЫДАВА**

анонсы

# Навагоднія [illegible]ыгоды і казкі п[illegible]рачку

КНІЖНЫ СВЕТ АЎТОРАК

**Да канца 2022 года ў Выдавец[illegible] калькі кніг, адрасаваны[illegible] во-гуле ў Беларусі добра вел[illegible]аснову-Гусачэнку. Яе п’еса-к[illegible]есумненна, будзе запатрабава[illegible]чынкамі, і для пастаноўкі на п[illegible]вае свой цыкл кніг пра дамавічкоў. [illegible]авічкі Шушык і Жуля».**

Алег Ждан-Пушкі[illegible] чытаюць і дарослыя, [illegible] наваў выдавецтву сваю [illegible]ігу «Урод» (разам сабраны [illegible] гісто-рыі, якія выходзяць на рускай мове). Павел Гушынец адрасуе падлеткам адразу два выданні — «Сказки для Веснушки. Поиск черного кота» і «Сказки для Веснушки. Дайга». Ірына Карнаухава працягвае расказваць аб прыгодах на Байкале — гэтым разам у кнізе «Байкальский солнцеворот». Марына Петрашкевіч [illegible]пісала і прапанавала «Звяздзе» сваю першую казку — «Гарадскі дамавік». Выдавецтва ўбачыла ў прапанаваным тэксце цікавы і варты ўвагі твор. Выйдзе таксама кніга дзіцячай пісьменніцы Іны Фраловай «Дзе была сарока».

Выключна цікавай, па меркаванні выдаўцоў, з’яўляецца і наступная навінка — кніга Алены Стэльмах «Пашка і сонечны праменьчык». Людміла Даманская напісала твор, які будзе запатрабаваны і выхавальнікамі дзіцячых садкоў — «Правила безопасности в книжке для малыша и малышки». Не абмінайце ўвагай і «Казкі пра вавёрачку і яго сяброў» Алега Мельнікава. А ў «Зборніку празаічных твораў для чытання ў VII класе» (выйдзе ў серыі «Школьная бібліятэка класікі») чытача чакаюць сустрэчы з апавяданнямі «Мэры Кэт» Міколы Лупсякова, «Урок арыфметыкі» Вячаслава Адамчыка, «Першае каханне» Уладзіміра Аляхновіча, «Горкі ліпавы мёд» Алены Васілевіч, «Зорны камень» Уладзіміра Шыціка, «Апошні гусляр» Яраслава Пархуты.

Вось такі падарунак — тузін выданняў для дзяцей — прапануе юнаму чытачу Выдавецкі дом «Звязда» ў пярэдадзень Новага года. Прыемнага ўсім чытання!

**Сяргей ШЫЧКО**

супрацоўніцтва

# Хлебам адзіным

**Самарская абласная арганізацыя беларусаў і выхадцаў з Беларусі «Руска-Беларускае Братэрства 2000» выступіла ініцыятарам устанаўлення партнёрскіх адносін паміж бібліятэкамі і школамі і правядзення міжнароднага тэлемоста Самара — Брэст.**

Праўленне арганізацыі самарскіх беларусаў прапанавала бібліятэкам гарадоў-партнёраў, а менавіта муніцыпальнай бюджэтнай установе культуры гарадской акругі Самара «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк / Дзіцячая бібліятэка № 14 — Бібліятэка народаў Паволжа» і ўстанове культуры «Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. С. Пушкіна / Брэсцкая цэнтральная гарадская дзіцячая бібліятэка — філіял № 13» стаць партнёрамі і правесці першае сумеснае мерапрыемства, прымеркаваўшы яго да Сусветнага дня хлеба, з запрашэннем школьнікаў.



*Галіна Маліноўская.*

13 кастрычніка на пляцоўках бібліятэк у рэжыме відэаканферэнцыі адбыўся міжнародны тэлемост, а галоўнымі яго ўдзельнікамі сталі школьнікі муніцыпальнай бюджэтнай агульнаадукацыйнай установы «Школа № 13 імя Героя Савецкага Саюза Ф. В. Санчырава» гарадской акругі Самара (дырэктар Ірына Токмань), дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 13 г. Брэста імя У. І. Хавана» (дырэктар Ганна Валынец) і дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 21 г. Брэста» (дырэктар Аляксандр Вяленка).

Прывітанне ўдзельнікам тэлемоста накіравала Ірына Міхайлаўна Глуская, прэзідэнт Самарскай абласной арганізацыі беларусаў, член Савета пры Губернатары Самарскай вобласці па міжнацыянальных адносінах.

— Бібліятэкі як установы культуры закліканы вырашаць вельмі важныя задачы, сярод якіх асаблівае месца займае маральнае выхаванне дзяцей і моладзі. У цяперашніх умовах вельмі важна фарміраваць у падрастаючага пакалення патрыятычную свядомасць, пачуцці грамадзянскай адказнасці за свае ўчынкі, — гаворыцца ў прывітанні.

Мікалай Бойка, член БСЖ, галоўны рэдактар часопіса «Адзінства» / «Единство» запрасіў удзельнікаў тэлемоста да супрацоўніцтва:

— Часопіс абласной арганізацыі беларусаў выдаецца з 2014 года ў друкаваным і электронным варыянтах. І мы будзем вельмі рады супрацоўніцтву з бібліятэкамі і школамі. Бібліятэкары, педагогі, бацькі, юнакі і дзяўчаты могуць адпраўляць на наш адрас свае творы, якія будуць размяшчацца як у друкаваным выданні, так і на электронных рэсурсах самарскіх беларусаў.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў тэлемоста Самара — Брэст звярнуліся Святлана Гарадзецкая, дырэктар ДУК «Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. С. Пушкіна», і Галіна Маліноўская, загадчыца МБУК гарадской акругі Самара «Дзіцячая бібліятэка № 14 / Бібліятэка народаў Паволжа».

ДУА «Сярэдняя школа № 21 г. Брэста» прадставіла відэаролік тэатральнай пастаноўкі (кіраўнік А. Сандрыкава) па казцы Канстанціна Паўстоўскага «Цёплы хлеб». Паэтычныя творы чыталі навучэнцы ДУА «Сярэдняя школа № 13 г. Брэста імя У. І. Хавана». Бібліятэка народаў Паволжа прадставіла ўдзельнікам праграму «Ржаной хлебушко — калачу дедушка», відэаролік «Хлеб — усяму галава».

Другая частка тэлемоста Самара — Брэст называлася «Дзеці — дзецям. Вы спыталі — мы адказалі: анлайн размова дзяцей». Брэсцкія школьнікі задавалі пытанні самарскім хлопцам і дзяўчатам пра славутасці горада на Волзе, пра школьнае жыццё… Самарскіх аднагодкаў цікавілі пытанні пра брэсцкія музеі, якія кнігі чытаюць школьнікі Брэста…

— Міжнародны тэлемост Самара — Брэст паслужыць добрым пачаткам адукацыйнага і творчага супрацоўніцтва бібліятэк і школ, — пераканана Ірына Глуская.

**Прэс-служба САГА «Руска-Беларускае Братэрства 2000»**

вернісажы

# Позірк фотамайстра

**У мінскай публічнай бібліятэцы № 1 імя Льва Талстога адкрылася выстаўка фотамастака Міхаіла Крыжаноўскага «Хараство зямлі і слова». Аўтар прадставіў некалькі дзясяткаў фотаработ, выкананых за апошнія гады. Яны паказваюць прыгажосць беларускіх краявідаў, цікавых людзей, знакамітыя мясціны, святы і мерапрыемствы ў розных кутках нашай Радзімы.**

На ўрачыстым адкрыцці, якое вёў пісьменнік, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхась Пазнякоў, выступілі паэты Уладзімір Мазго і Таццяна Барысюк. Вершы беларускіх аўтараў прагучалі з вуснаў артысткі, мастацкага кіраўніка Мінскага гарадскога тэатра паэзіі Вольгі Багушыньскай. Папуры паводле сваіх песень выканаў знакаміты кампазітар, народны артыст Беларусі Эдуард Ханок. Выступіла таксама загадчык бібліятэкі Лола Іназемцава.

Міхаіл Крыжаноўскі расказаў пра асноўную задачу выстаўкі і адказаў на пытанні наведвальнікаў. Экспазіцыя будзе працаваць на працягу месяца.

**Павел КУЗЬМІЧ**

праекты

# Мой родны кут, як ты мне мілы…

**Радкі вялікага песняра сталі эпіграфам для творчага задання ўдзельнікам студыі юных літаратараў «Малінаўскія галасы». Кіраўнік студыі паэтэса Іна Фралова не абмяжоўвала выхаванцаў выбарам радка, таму былі работы не толькі празаічныя.**

Звярталіся да твораў класіка і калі зама-цоўвалі на практыцы розныя віды рыфмаў. Тое, што ўсе ўдзельнікі гуртка даўно лічаць сябе сур’ёзнымі дарослымі людзьмі, не было падставай адмовіцца ад вясёлых гульняў і практыкаванняў. Таксама абмяркоўвалі ўдзел у літаратурным конкурсе, які прапанавалі супрацоўнікі бібліятэкі.

**Ганна СТАРАДУБ**

«ЛіМ»-люстэрка

Гастролі Пермскага тэатра «Каля Моста» пройдуць на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі 2 і 3 снежня, паведамляюць ва ўстанове культуры. Замежныя госці прадставяць ірландскую камедыю «Калека з Інішман» і фантастычную камедыю «Жаніцьба. Фантасмагорыя». Рэжысёрам абодвух спектакляў выступае Сяргей Фядотаў. «Пастаноўкі гэтага рэжысёра з’яўляюцца, па сутнасці, мостам паміж рэальным і тагасветным, бытавым і містычным, свядомым і інтуітыўным. Выключнасць мастацкага метаду Сяргея Фядотава ў тым, што ён накіраваны на развіццё традыцый рускага псіхалагічнага тэатра, узбагачанага адкрыццямі школ Міхаіла Чэхава і Ежы Гратоўскага, гэта значыць, сістэмамі, накіраванымі на развіццё псіхафізікі акцёра, яго здольнасці працаваць з унутранай энергіяй і сваёй падсвядомасцю», — расказалі ў тэатры.

Расійскі этнаграфічны музей прадставіў у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі выстаўку «Шкатулка каштоўнасцей», прысвечаную традыцыйным упрыгажэнням народаў Еўразіі XVII—XX стагоддзяў. Наведвальнікі могуць убачыць больш за 250 шэдэўраў, якія характарызуюць ювелірную традыцыю і эстэтычныя густы амаль 40 народаў Расійскай імперыі. Збор Расійскага этнаграфічнага музея налічвае каля 13 тыс. прадметаў, якія належаць культуры народаў Беларусі. У экспазіцыі — унікальны помнік беларускай культуры — слуцкія паясы, а таксама прадметы, якія прадстаўляюць славянскія народы еўрапейскай часткі Расіі, Прыбалтыкі, Паволжа, Каўказа, Казахстана і Сярэдняй Азіі, Сібіры і Далёкага Усходу. Праект прадстаўляе разнастайнасць нацыянальных культур на прыкладзе ювелірнага майстэрства. Убачыць «Шкатулку каштоўнасцей» можна да 11 снежня.

Анлайн-кінатэатр *KION* паведаміў аб хуткім рэлізе дакументальнага фільма-расследавання «Пялевін». Стужка пра галоўнага містыфікатара расійскай літаратуры Віктара Пялевіна стане даступная падпісчыкам кінатэатра з 22 лістапада. Аўтар «*Generation П*» вось ужо 20 гадоў захоўвае поўную ананімнасць, пры гэтым выпускае па кнізе кожны год. Рэжысёр «Пялевіна» Радзівон Чэпель, вядомы па фільме «Дураў», вывучыў мноства архіваў і ранніх работ, правёў дзясяткі інтэрв’ю са знаёмымі і калегамі пісьменніка з мэтай высветліць, кім з’яўляецца сапраўдны Віктар Пялевін. Адзначаецца, што праект выкананы на стыку дакументалістыкі і анімацыі. Стварэннем карціны займалася студыя «Амурскія хвалі», гаворыцца на сайце анлайн-кінатэатра *KION*.

Расійскія археолагі знайшлі артэфакты часоў Паўла I (канец XVIII — пачатак XIX стагоддзя) на раскопках у 4-м Круціцкім завулку ў Маскве. Сярод выяўленых прадметаў — патэльні з жалезным чапельнікам, некалькі непашкоджаных белагліняных варачных гаршкоў, абломкі кубкаў і сподак з сінім раслінным арнаментам дэлфцкай вытворчасці. Як адзначаюць даследчыкі, іх выраблялі ў той час у вялікай колькасці і цэлымі караблямі завозілі ў розныя краіны. Артэфакты адправілі на рэстаўрацыю. Пасля яны будуць перададзены на захоўванне ў музей, перадае «ИТАР-ТАСС».

У Атланце (штат Джорджыя, ЗША) пачаўся здымачны працэс стужкі «Мегалаполіс». Фільм ад аўтара «Хроснага бацькі» Фрэнсіса Форда Копалы павінен выйсці ў 2024 годзе. Сярод акцёраў, якія задзейнічаны ў стужцы, — Шая Лабаф і Наталі Эмануэль. Сюжэт фільма развіваецца вакол генія-архітэктара (ролю выконвае акцёр Адам Драйвер), які марыць пабудаваць горад будучыні пасля маштабнага разбурэння. Гэта першы поўнаметражны фільм Фрэнсіса Форда Копалы пасля хорару «Паміж» 2011 года. На вытворчасць «Мегалаполіса» рэжысёр выдаткуе не менш за 100—120 млн долараў з уласнага бюджэту, удакладняе «*film.ru*».

Археолагі знайшлі ў водах тэрмальнай крыніцы тасканскага горада Сан-Кашана-дэі-Баньі калекцыю бронзавых статуй, піша РІА «Новости». Большасць знаходак датуецца II стагоддзем да нашай эры — I стагоддзем нашай эры. Калекцыю ўжо назвалі найбуйнейшым сховішчам бронзавых статуй этрускага і рымскага перыядаў, калі-небудзь выяўленым у старажытнай Італіі, і адной з самых значных ва ўсім Міжземнамор’і. Знойдзенае не мае сабе роўных найперш таму, што да гэтага часу з той эпохі былі вядомы ў асноўным тэракотавыя статуі. Бронзавыя скульптуры з Сан-Кашана адлюстроўваюць бажаствы, а таксама органы і часткі цела, для якіх запытвалася медычнае ўмяшанне бажаства пасродкам тэрмальных вод. Акрамя 20 бронзавых статуй, у свяцілішчы знойдзены пяць тысяч залатых, сярэбраных і бронзавых манет, дары і прадметы культу.

**Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**

# Паэзія кіно

**Паводле даўняй традыцыі, урачыстая цырымонія адкрыцця XXVIII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» пачалася з чырвонай дарожкі. Пад гукі фанфараў па пунсовым дыване, высланым у холе кінатэатра «Масква», прайшліся госці з Расіі, Сербіі, Ізраіля, Турцыі, Егіпта, Германіі, дэлегацыі з Кітая і Таджыкістана. Прысутнічалі і зоркі: апрача іншых, цырымонію наведалі народныя любімцы Уладзімір Гасцюхін, Наталля Варлей, Алег Фамін, дырэктар Міжнароднага ерэванскага кінафестывалю «Залаты абрыкос» Хачатран Аруцюн, сербскі сцэнарыст, прадзюсар, пастаянны член журы многіх кінафорумаў Ёван Маркавіч, турэцкі акцёр Мустафа Віран Джэфа Кючукбайрак ды іншыя.**

Пасля першых урачыстасцей цырымонія перамясцілася ў кіназалу. Адкрыў афіцыйную частку мерапрыемства намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Ігар Петрышэнка. Ён зачытаў са сцэны прывітальны зварот Аляксандра Лукашэнкі да ўдзельнікаў свята: «Сёлетняе мерапрыемства пад дэвізам "Сапраўдныя каштоўнасці" аб'яднала беспрэцэдэнтную колькасць удзельнікаў і шчыра вітае на нашай мірнай зямлі аднадумцаў — заслужаных мэтраў, таленавітую моладзь, якая робіць першыя крокі ў фільмавытворчасці, і шчырых аматараў кінематографа». Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што форум прадоўжыць добрыя традыцыі па падтрымцы ідэалаў гуманізму.

Уласна, першай важнай падзеяй кінафестывалю стала ўручэнне спецпрыза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве». Ганаровую ўзнагароду атрымаў кінарэжысёр, сцэнарыст, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Вячаслаў Нікіфараў, які зусім нядаўна адсвяткаваў свой 80-гадовы юбілей. Прымаючы віншаванні, Вячаслаў Аляксандравіч адзначыў: «Наша беларускае кіно ўяўляе сапраўднае мастацтва, высокую паэзію. Наша літаратура ў асобе такіх светачаў, як Караткевіч, Быкаў, Адамовіч, Мележ, Дудараў, Казько, перадала беларускаму кіно эпічны маштаб і чалавечнасць». Дарэчы, у праграме сярод іншага былі і паказы класічнай карціны Вячаслава Нікіфарава «Зімародак», якой сёлета спаўняецца 50 гадоў.

Фота БелТА.

*Шоу-балет «Ф'южн».*

Фота БелТА.

*Ігар Петрышэнка і Вячаслаў Нікіфараў.*

Узнагароды ўзнагародамі, а ўсё ж такі фестываль не можа лічыцца адкрытым, пакуль не будзе разбіта талерка з аўтографамі ўдзельнікаў мінулагодняга свята. Традыцыі гэтай ужо шмат гадоў, не перарваў яе і XXVIII «Лістапад». Дзеля выканання сімвалічнага абраду на сцэну падняўся старшыня фестывалю народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў. «Мы верым у тое, у што мы верылі. Мы спадзяёмся на тое, на што спадзяваліся. Мы ведаем, што існуе любоў, мір, шчасце, вера ў Бога, вера ў чалавечыя магчымасці. Нас шмат. Мы не альтэрнатыўны культурны працэс, мы сапраўдны культурны працэс. Мы адэпты сапраўднай культуры, і мяне гэта сагравае і радуе. Я спадзяюся, так будзе заўжды», — сказаў Аляксандр Васільевіч — і фарфор разляцеўся па сцэне!

На цырымоніі адкрыцця адбылася прэм'ера песні «Лістапад» музычнага праекта «Зямля і неба». Акрамя таго, гледачоў чакалі сустрэчы з гуртом «Верасы», шоу-балетам «Ф'южн», дзіцячым танцавальным ансамблем «Хвілінка». Са сцэны гучалі савецкія кінашлягеры, а таксама класіка беларускай кампазітарскай школы — загаловачная мелодыя фільма «Дзікае паляванне караля Стаха», напісаная народным артыстам СССР Яўгенам Глебавым. У фінале цырымоніі ізраільскі тэнар Тэльман Гужэўскі (між іншым, сябра журы асноўнага конкурсу ігравога кіно) з салістамі Вялікага тэатра Беларусі Мартай Данусевіч і Дзмітрыем Шабецем выканалі ўрывак з вядомай оперы Джузэпэ Вердзі «Травіята».

Пасля ўсіх урачыстасцей пачаўся першы ў рэпертуары кінасеанс. Гонар адкрываць конкурсную праграму выпаў расійскай стужцы «Плакаць нельга» рэжысёра Наталлі Назаравай. Сінопсіс юрыдычнага трылера наступны: «Руская эмігрантка ў Скандынавіі адпраўляе сына ў школу, але той не вяртаецца. У пошуках дзіцяці яна аказваецца ў тупіку: па законах "новай" ювенальнай юстыцыі, яе сын з'яўляецца ўласнасцю дзяржавы». Фільм прэзентавалі яго стваральнікі — прадзюсар карціны Вадзім Быркін, актрыса Святлана Чуйкіна і госць з Германіі акцёр Дзірк Мартэнс, якому дасталася невялікая роля.

Усяго да ўдзелу ў фестывалі было пададзена 1360 заявак з 89 краін свету. З іх арганізатары адабралі найлепшыя, якія ў выніку і склалі праграму XXVIII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад». Адно з новаўвядзенняў гэтага года — праграма анімацыйнага кіно. Мінулым разам мультфільмы не мелі асобнай платформы для спаборніцтва, яны ўваходзілі ў конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік». Сёлета дзіцячыя фільмы і анімацыю было вырашана раздзяліць. Разам з праграмамі ігравога і неігравога кіно праграмы анімацыі і «Лістападзіка» налічваюць каля 80 карцін. Агулам жа на фестывалі ў гэтым годзе было прадэманстравана каля 100 фільмаў.

**Каміла НАВІНКІНА**

# Вера ў сапраўд[illegible]ю дружбу

КІНО ПЯТНІЦА

Фота БелТА.

**Здавалася б, не паспеў фестываль пачацца, а ўжо вядомы і першыя прызёры… Урачыстая цырымонія закрыцця конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік» прайшла ў вялікай зале кінатэатра «Піянер» 7 лістапада. Падчас мерапрыемства былі абвешчаны імёны пераможцаў напружанага кінаспаборніцтва. Удзельнікі яго спрачаліся ў шасці намінацыях, у тым ліку за званні найлепшых фільмаў па версіях гледачоў і савета юных кінакрытыкаў. Цяпер, калі ўсе пераможцы вызначаны, а прызы ўручаны, надышоў час падсумаваць вынікі.**

У «Лістападзіку» ўзялі ўдзел 6 поўнаметражных фільмаў, створаных у 2021 — 2022 гадах. Галоўная ўзнагарода — на рахунку расійскай кінакарціны «Звон надзеі» рэжысёра Аляксандра Куляміна (яго фільм «Новенькі» стаў трыумфатарам мінулагодняга «Лістападзіка»). «Звон надзеі» прызнана найлепшай карцінай у конкурсе па выніках галасавання журы ў складзе генеральнага дырэктара кінастудыі «Таджыкфільм» Махмадсаіда Шахіёна, кіраўніка прадзюсар[illegible] Канстанціна Ёл[illegible] тэлевядучай [illegible] дэмічн[illegible] [illegible]ld Vision [illegible]чявачкі, [illegible]а ака- [illegible]-Макей. [illegible]дзначыў, што [illegible]рыняцце канчат- [illegible]дзілася ўсяго тры дні. [illegible] адгледзець усю праграму[illegible]варыта. Па словах шаноўнага [illegible]омеркаванне суправаджалася га- [illegible]. «Фільм, які мы выбралі як найлеп- [illegible]льмі актуальны. Ён створаны для цяпе- [illegible] часу і адлюстроўвае тое, чаго не хапае, — веру [illegible]раўднае сяброўства», — адзначыў старшыня журы.

У сваю чаргу Вера Палякова-Макей у адзін з фестывальных дзён, маючы на ўвазе стужку «Звон надзеі», прызналася: «Мяне складана расчуліць, таму што я ведаю, як робіцца кіно, але на адным з фільмаў я плакала чатыры разы за сеанс! Дзіцячае кіно ёсць, яно здымаецца, і яно цікавае!» Пасля цырымоніі закрыцця «Лістападзіка», каментуючы перамогу свайго фаварыта, актрыса падкрэсліла: «Я стараюся ацэньваць любое мастацтва сэрцам і душой. Мастацтва можа выяўляцца па-рознаму: розныя могуць быць формы, рашэнні сцэн, прыдумкі, але калі кіно трапляе ў самае сэрца, калі выклікае эмоцыі, ён варты самай пільнай увагі. Галоўнае, што павінна быць у фільмах для дзяцей, — эмоцыі».

Зрэшты, на рахунку фільма «Звон надзеі» няхай і галоўная, але толькі адна ўзнагарода. Сапраўдным жа трыумфатарам «Лістападзіка-2022» стала іншая карціна расійскай вытворчасці — «Зоркі мне паказуць шлях» рэжысёра Філіпа Абруціна. Работа ўдастоена асаблівага прыза дзіцячага журы, у склад якога ўвайшлі беларускія старшакласнікі, прыза сімпатый гледачоў, а таксама дзвюх акцёрскіх узнагарод. Выканаўцы галоўных ролей Лізавета Бугулава і Іван Салаўёў атрымалі прызы ў намінацыях «Найлепшая дзіцячая роля» і «Найлепшая работа дарослага акцёра ў дзіцячым фільме» адпаведна. «Гэты фільм зачараваў нашы сэрцы», — адзначылі падчас цырымоніі члены дзіцячага журы.

Спецыяльны прыз журы конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік» дастаўся турэцкаму фільму «Абруч» («Баскетбольнае кольца»), знятаму рэжысёрам Ахметам Токлу. Па меркаванні Канстанціна Ёлкіна, «Абруч» — гэта «на ўсе 100

Фота БелТА.

дзіцячае кіно». Спецыяльнымі дыпломамі адзначаны адзіная анімацыйная работа ў конкурсе «Новыя багі. Адраджэнне Нэчжы» (рэж. Чжаю Цзі, Кітай) і іграўвыя фільмы «Як прымусіць бацькоў развесціся!» (рэж. Сандрын Брадэр-Дэразье, Канада), «Тарлан» (рэж. Юлія Захарава, Казахстан, Расія). Больш падрабязна пра лаўрэатаў «Лістападзіка», вынікі астатніх конкурсных праграм чытайце ў наступных нумарах газеты.

**Каміла НАВІНКІНА**

**Навукоўцаў, даследчыкаў і аматараў творчасці народнага пісьменніка з розных устаноў і рэгіёнаў Беларусі сабрала 36-я Міжнародная навуковая канферэнцыя «Каласавіны», прымеркаваная да 140-годдзя народнага песняра, якая нядаўна прайшла ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа.**

Пачалася канферэнцыя з урачыстасці — прывітальнага слова да гасцей мерапрыемства першага намесніка міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерыя Грамады. У фонды ўстановы быў перададзены прывітальны Адрас ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. За вялікі ўклад у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, папулярызацыю нацыянальнай культуры і заслугі ў развіцці музейнай справы калектыву ўстановы была аб'яўлена Падзяка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі Качанавай. За шматгадовую плённую

# Ад літаратураз[illegible]а да матэматыкі, ад [illegible]ур'ёзнага

ЛІТАРАТУРА ПАНЯДЗЕЛАК

дзейнасць па захаванні і папулярызацыі [illegible]най культуры Ганаровай граматай Міністэр[illegible]туры Рэспублікі Беларусь узнагародзілі супр[illegible] Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага муз[illegible] Коласа — вядучага навуковага супрацоўніка Іры[illegible]ловіч і вучонага сакратара Марыю Казакевіч; Гра[illegible]

*Валерый Грамада і Ірына Мацяс.*

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь — дырэктара Ірыну Мацяс і галоўнага фондазахавальніка Васіліну Міцкевіч. Павіншаваў калег і калектыў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый Марозаў агучыў прапанову аб супрацоўніцтве з музеем у галіне фарміравання літаратурных тураў. Падчас урачыстасці выступоўца зазначыў, што аб'екты літаратурнага жыцця краіны вядомы сярод моладзі не ў той ступені, як таго хацелася б. Работа з дзецьмі і маладымі людзьмі, распрацоўка фармату новых экскурсій і тураў, што заахвочвалі б і школьнікаў, і студэнтаў да больш глыбокага знаёмства з літаратурнай спадчынай, наведванне месцаў памяці, якія сведчаць аб багацці айчыннага пісьменства — гэта тое, у чым сёння ёсць патрэба зрабіць абнаўленні, прапанаваць новыя маршруты, адаптаваныя да сённяшніх вандроўнікаў.

Адным з найцікавейшых дакладаў, зачытаных на пленарным пасяджэнні канферэнцыі, быў расповед прафесара, доктара гістарычных навук Эмануіла Іофе. На працягу многіх гадоў даследчык і культуролаг цікавіўся малавядомымі старонкамі жыцця Якуба Коласа, і вынікам гэтага стала тое, што ён захаваў унікальныя здымкі пісьменніка, зробленыя ў 1942 годзе акадэмікам Мікалаем Ярмоленкам у Ташкенце. Вучоны агучыў гісторыю сяброўства слыннага песняра з акадэмікам Уладзімірам Пічэтам, сям'ёй акадэміка Канстанціна Горава і некаторымі іншымі вядомымі асобамі.

Арыгінальнасцю вылучыўся даклад кандыдата філалагічных навук, супрацоўніка філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» Анатоля Трафімчыка. Неардынарнасць даследчыцкай думкі палягала ў спробе, паводле яго слоў, «раскласці літаратуразнаўства на матэматыку». Абагульненыя даныя — вынікі параўнання некаторых параметраў, датычных аб'ёму паэмы Я. Коласа «Новая зямля» з іншымі эпічнымі творамі з гісторыі літаратуры, пачынаючы са старажытнаіндыйскага эпасу і да твораў XIX стагоддзя, ён прадставіў у выглядзе адной табліцы. Асноўны падыход, якім кіраваўся пры тлумачэнні некаторых пытанняў аб'ёму «Новай зямлі» А. Трафімчык, — дыялектыка твораў мастацтва, якая, на думку даследчыка, спарадзіла так званую сугестыю мастацкага твора. То-бок, хаця «Новая зямля» і лічыцца «энцыклапедыяй сялянскага жыцця», паэма не з'яўляецца самым вялікім па змесце творам, датычным сялянскага побыту. Але, як перакананы вучоны, у плане вычарпальнасці твор праз гэта нічога не страчвае, а толькі набывае: інакш ён не чытаўся б так лёгка, на адной хвалі.

Далей работа канферэнцыі праходзіла ў трох асобных коласазнаўчых секцыях, [illegible]яднаных тэматычна, дзе разглядаўся самы [illegible] спектр пытанняў.

[illegible] творчай індывідуальнасці Якуба [illegible]ы розных вядомых асоб, якія глыбока [illegible]валі постаць слыннага песняра, а таксама [illegible]граванні на старонках перыядычных выдан[illegible] — айчынных і замежных. Іншыя даследчыкі ўздымалі пытанні адметнасцей успрымання і перакладу твораў Я. Коласа. Некаторыя звярнуліся да дзейнасці паэта як перастваральніка на родную мову твораў сусветнай літаратуры. Шэраг выступоўцаў распавядалі пра дакументы сям'і народнага пісьменніка, невядомыя шырокай аўдыторыі.

Калі з літаратурнай спадчынай песняра ў той ці іншай ступені знаёмыя ўсе, то пра яркую пасіянарную пазіцыю, актыўную грамадскую дзейнасць Якуба Коласа — як ён дамагаўся адкрыцця школ, паляпшэння ўмоў жыцця дзяцей-сірот, у гады вайны дапамагаў эвакуіраванаму насельніцтву ў самых розных пытаннях; колькім суайчыннікам ён дапамог грашыма, простай чалавечай падтрымкай, добрым словам — ведаюць нямногія. Між тым гэта — адзін з маладаследаваных бакоў постаці Якуба Коласа. Так, гісторыю пабудовы школы ў Мікалаеўшчыне агучыла ў дакладзе доктар філалагічных навук, прафесар філіяла «Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» Валянціна Мароз. Адметна тое, што даследчыца была выпускніцай гэтай знакамітай школы, пабудаванай у 1948 годзе дзякуючы намаганням Якуба Коласа. А да таго часу дзеці вучыліся па хатах. Яны вымушаны былі ісці на заняткі з бярэмем дроў у хадодную пару года — такой была надзённая патрэба тых няпростых часоў. Пісьменнік штурмаваў органы ўлады лістамі, кантраляваў розныя моманты будаўніцтва школы, узяў на сябе клопат набыцця літаратуры для вучобы, вырашаў пэўныя праблемы, звязаныя з фінансаваннем. А колькі звярталася да яго простых вяскоўцаў! Людзі былі ўпэўнены, што ён не пакіне іх сам-насам з бедамі...

Пра дзейнасць Якуба Коласа ў якасці народнага дэпутата распавяла загадчык навукова-асветніцкага аддзела Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея песняра Вольга Наважылава. На працягу года

*З дакладам выступае Васіліна Міцкевіч.*

*Фрагмент экспазіцыі.*

музейшчыкі збіралі звесткі па гэтай тэме. Так, сярод задач, якія вырашаў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, было пасляваеннае аднаўленне гарадоў і асвятленне вуліц, рамонт дарог і ашчаднае выкарыстанне электрычнасці, вяртанне ў Беларусь інтэлігенцыі і высокакваліфікаваных работнікаў…

Сярод іншых пытанняў у межах канферэнцыі немалаважнай стала і дыскусія аб тым, як зрабіць асобу народнага пісьменніка больш блізкай, зразумелай цяперашнім навучэнцам. Адным з самых крэатыўных спосабаў злучыць мінулае з сучасным у папулярызацыі беларускага класіка можна лічыць прыдумку Івана Дубовіка. Вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа распрацаваў своеасаблівую гульню, скіраваную на прыцягненне ўвагі дзяцей да асобы песняра і яе вывучэння. Галоўнае ў літаратурным квэсце — выйсці з пэўнага часавага лабірынта, куды трапляе ўдзельнік праз верш Якуба Коласа. У дакладзе пад назвай «"Пятля часу" ў Сёмкаве: вопыт эксплуатацыі» даследчык распавёў пра тое, як прынялі яго вынаходніцтва юныя сучаснікі.

Адметнымі звесткамі, асаблівым пераасэнсаваннем рэалій, у якіх жыў і ствараў Якуб Колас, арыгінальнасцю падыходаў парадавалі даклады кандыдата філалагічных навук, супрацоўніка Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Віктара Жыбуля, галоўнага захавальніка фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Васіліны Міцкевіч, кандыдата філалагічных навук, дацэнта, дактаранта філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдата філалагічных навук, дацэнта Міколы Труса, супрацоўніцы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Настассі Трафімчык і іншыя.

**Марыя ЯРАШЭВІЧ**
**Фота Кастуся ДРОБАВА**

## У сэрцы кожнага

**Каб лепей адчуць атмасферу, у якой праходзілі «Каласавіны», прапануем паглядзець на падзею вачыма адной з яе ўдзельніц, Валерыі Філіпенкі, старшага выкладчыка кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы БДУКМ:**

«У "Каласавінах" вырашыла прыняць удзел упершыню — атрымалася, што якраз да юбілею. Прыехала я з даследаваннем "Дэтэрмінанта творчасці асобы ў творах Якуба Коласа". Нягледзячы на тое, што тэма гэтая культуралагічная, яна будзе цікава і аматарам творчасці песняра, і навукоўцам, у кола інтарэсаў якіх уваходзіць пытанне відаў творчасці ў сучаснай сацыякультурнай прасторы, матываў, якія натхняюць пэўнага творцу на розныя віды творчасці, і для культуролагаў, якія займаюцца дэтэрмінацыяй таго ці іншага творчага акта. Ад іншых удзельнікаў канферэнцыі хацелася б пачуць, хто ёсць Колас для кожнага з іх, які след ён пакінуў для іх як навукоўца і якія перспектывы мы бачым для яго як паэта зямлі беларускай. Гаворачы словамі Шпенглера, калі культура — жывая вада, то мова Я. Коласа — жывая вада для беларускай культуры. Для мяне Колас — творца, які прыйшоў яшчэ ў дзяцінстве з казкамі, у юнацтве — з душэўнымі пошукамі падчас чытання «Сымона-музыкі». У старэйшым узросце — гэта вершы пра вайну: Колас усім сэрцам любіў сваю зямлю і ў кожным радку яго глыбокі патрыятызм і любоў да Радзімы. А цяпер, калі я ўжо выкладчык, для мяне Колас — гэта філасофія…»

**Падрыхтавала Марыя ЯРАШЭВІЧ**

# «Карагод» набліжае Новы год

КРЫТЫКА ЧАЦВЕР

Гэтымі днямі у Выдавецкім доме «Звязда»« пабачыла свет новая кніга Ніны Галіноўскай «Крылатыя дружбакі». Каб даведацца, з чым хлопчыкі і дзяўчынкі ў ёй сустрэнуцца, дастаткова нават двух вершаў. Першы — «Шпакі»:

*Разбудзілі мяне рана*
*Галасістыя шпакі.*
*Я стаю усхваляваны:*
*— Малайчыны, спевакі!*
*Песня свеціць, песня грэе,*
*Песня звоніць ручаём.*
*Ад яе вясна дабрэе,*
*Носіць кветкі ў кожны дом.*

Другі называецца «Гусак-фігурыст»:

*У гусака ад рання*
*Фігурнае катанне.*
*Паставіў ён пласцінку —*
*Вясёлую «Калінку».*
*— Танцуе хвацка. Гляньце,*
*Як на чэмпіянаце, —*
*Дзівуюцца глядачкі —*
*Чубаткі, гускі, качкі.*
*— Трайное робіць сальта.*
*— Узнагародзіць варта.*
*— Выдатны фігурыст.*
*— Гусак у нас артыст!*

Я невыпадкова працытаваў гэтыя два вершы, бо яны (не магу сказаць, што так і задумвала Ніна Васільеўна, а менавіта гэтак атрымалася) у пэўнай ступені і даюць уяўленне аб творах, што склалі змест. З аднаго боку — традыцыйная тэматыка, якая адпавядае аўтарскай задуме, — пазнаёміць дзетак з беларускай фаўнай, а калі канкрэтней — з яе крылатымі прадстаўнікамі, многіх з якіх яны ведаюць, а калі не, то атрымліваюць такую магчымасць. З другога — зрабіць гэта як мага дасціпней, займальна, а ў многіх выпадках і так, каб ва ўчынках птушак хлопчыкі і дзяўчынкі ў нечым пазнавалі і саміх сябе.

Цікавая атрымалася кніжка. У ёй «ад балота да балота, // Ад суботы да суботы»

спяшаецца нястомны падарожнік («Драч-пешаход»), гушкаюцца на галінцы вераб'і («Зялёныя арэлі»), жабкі скачуць «Крыжачок» («Летні танец»), ліска вырашыла стаць гандляркай («На кірмаш»)… Можна даведацца і пра тое, што атрымалася, калі папугай захацеў «з салаўём выступаць» («Чаму папугай не заглядвае ў гай») і пра нечаканую просьбу вароны («Гальштук»). Ды і, канешне, пра шмат што іншае.

Адметна і тое, што Ніна Галіноўская ў асобных выпадках умела спалучае вопыт творчы і выхаваўчы. Наконт першага ўсё зразумела. Доўга працуючы ў дзіцячай літаратуры, яна даўно налаўчылася (канешне, у добрым сэнсе гэтага слова) інтуітыўна адчуваць, што найлепш і найбольш зацікавіць маленькага чытача. Гэта тычыцца як выбару прадмета гаворкі, так і асэнсавання задуманага, выкарыстання адпаведных вобразна-выяўленчых сродкаў — усяго го, што і падпадае пад азначэнне крэты творчасці».

хаваўчы вопыт таксама сам па сабе ыходзіць. Але каб спасцігнуць яго ны, неабавязкова быць педагогам па адукацыі, бо асноўная прафесія асаблівага значэння не мае. Шмат значыць мастакоўская інтуіцыя, якая спрацоўвае не адразу, а становіцца вынікам зноў жа шматгадовай пісьменніцкай працы. Таму Ніна Васільеўна бездакорна ведае, у якіх выпадках да месца пэўныя дыдактычныя моманты, а дзе выратавальны ключык, калі хлопчыкі і дзяўчынкі, пазнаёміўшыся з чарговым выпадкам, гісторыяй, пададзенымі ў творы, старанна асэнсоўваюць іх. Тады тое, што не на паверхні, раскрые сваю сапраўдную сутнасць. Яскравы прыклад гэтаму — верш «Працую з дзедам»:

*Добра нам жывецца з дзедам:*
*Я сяджу пасля абеду,*
*Мые посуд мой дзядуля.*
*Мы не любім з ім мурзуляў.*
*Падмятае дзед падлогу —*
*Я стаю каля парога.*
*Дзед нясе прадукты з крамы,*
*Побач я бягу таксама.*
*Дзед цюльпаны паліваe,*
*Пра цюльпаны я спяваю.*
*Робім мы ўсё з дзедам самі —*
*Памагаем добра маме.*

Нібыта гэты хлопчык-апавядальнік і пры справе. Прынамсі, ён разумее, як важна дапамагаць матулі. Але калі задумацца над тым, пра што апавядаецца, то становіцца відавочным, што ён — усяго толькі сузіральнік клопатаў свайго дзядулі. Хай сабе і неабыякавы. Калі ўсё гэта зразумее чытач (ці слухач, калі пазнаёміцца з творам дзякуючы дарослым), ён упэўніцца, кажучы словамі Уладзіміра Маякоўскага, «что такое хорошо и что такое плохо». Несумненна, пасля гэтага ў адпаведнай сітуацыі павядзе сябе інакш, а то і сябрам падкажа, як трэба быць.

Крытыка ўжо неаднойчы адзначала, што Ніна Галіноўская — прызнаны майстар беларускай дзіцячай літаратуры. Радасна і тое, што яна не з тых, хто спачывае на заслужаных творчых лаўрах, а па-ранейшаму працуе плённа. Ды і ахвотна сустракаецца са сваімі маленькімі сябрамі — хлопчыкамі і дзяўчынкамі, якія любяць яе творы, набываюць кніжкі, напісаныя ёю. Перагортваў апошнія старонкі «Крылатых дружбакоў», і вось што падумаў.

Модным стала правядзенне розных майстар-класаў. А чаму б не наладзіць адзін з іх з Нінай Васільеўнай для тых аўтараў, якія толькі пачынаюць пісаць для дзяцей? Хоць мастакоўскія ўрокі будуць не лішнімі і для некаторых аўтараў, якія ўжо выдалі адну-дзве кніжкі. Гэта добра, што яны пашыраюць межы творчасці для дзяцей, надаючы сучаснае гучанне казцы, зазіраючы ў бязмежны свет фэнтэзі. Толькі, па-мойму, кепска, што яны часам забываюць, наколькі невычарпальныя магчымасці традыцыйнай паэзіі і прозы. А менавіта яе прасторы ўжо не адно дзесяцігоддзе плённа абжывае Ніна Галіноўская.

Урокі яе, безумоўна, будуць не лішнімі. Не ў апошнюю чаргу важны і вопыт кніжкі «Крылатыя дружбакі». Калі яе з такой цікавасцю прачытаў я, то што ўжо казаць пра саміх хлопчыкаў і дзяўчынак, якія падыходзяць мне ва ўнукі, а то і ў праўнукі. Асабліва маленькіх гараджан, якія часам не так і шмат бываюць на прыродзе. На старонках жа вершаў, казак, жартаў, што ўвайшлі ў кнігу, яна паўстае ва ўсёй красе і непаўторнасці. І, што для дзетак не менш важна, — казачна.

Ёсць у Ніны Васільеўны і кніжка «Незвычайны карагод». Даўняя, яна яшчэ ў 1986 годзе пабачыла свет. Гэтая — таксама своеасаблівы карагод, удзельнікамі якога з'яўляюцца многія «крылатыя дружбакі», што і падказалі ёй назву. Цудоўна, што чарговы «карагод» старэйшыны нацыянальнай дзіцячай літаратуры па-свойму набліжае Новы год.

**Язэп РУНЕВІЧ**

# Свабода альбо адзінота?

КРЫТЫКА АЎТОРАК

**Выдавецкі дом «Звязда» працягвае радаваць навінкамі бачыла новая кніга вядомай пісьменніцы, ваенна Чыж-Літаш «101 спатканне, альбо Дзённік свабодн лежыць таксама шэраг твораў, якія карыстаюцца**

У анатацыі напісана: «Гэтая кніга — пра мужчын, якія прыходзілі ў яе жыццё, не спаць, расчароўвацца. Яны змян побач: хвіліны, гадзіны ці месяц

Кожны з'яўляўся ў яе жыцці н

Гэтая кніга — адкрытая, шчыр

падтрымкі і плячо кожнаму цудоў

Выданне прываблівае ўжо вокла

Аляксандра Соца з'яўляецца тлумачэ

на старонках кнігі. Прыгожая Ганна Чы

аднак без вэлюму, які неаднаразова будз

у атачэнні самых розных мужчын.

У эру росквіту *Tinder* і *Badoo* адносіны паміж мужчынам і жанчынай перажываюць трансфармацыю. Ці цалкам рамантычныя адносіны ператварыліся ў спажывецкія стасункі? Як толькі чалавек перастае адпавядаць тваім патрабаванням, ён адпраўляецца на сметніцу разам з сапсаванай спадніцай і электрачайнікам?

Гэтыя пытанні не даюць спакою і Ганне Чыж-Літаш. Неаднаразова на старонках згадваюцца мабільныя праграмы, якія нельга называць. Аднак ніякага спакою і адказу яны не прыносяць. Ні аўтару, ні шматлікім іншым карыстальнікам.

Першая думка, якая прыходзіць яшчэ да пачатку чытання: магчыма, гэта новая Кэндэс Бушнел? Цяпер і ў Беларусі з'явіцца свой «Сэкс у вялікім горадзе»? Легендарны амерыканскі серыял, зняты па кнізе вядомай журналісткі, пасунуў рамкі дазволенага ў размовах грамадства і супакоіў не адзін дзясятак жанчын.

Аднак такое параўнанне памылковае. З першых старонак аўтар шчыра тлумачыць, што напісана кніга пра адзінокую жанчыну: «Чатыры гады я разбіваю сэрца, поўзаю на каленях, збіраючы яго асколкі, склейваю і зноў раскрываю мужчынам».

Вобраз адзінокай жанчыны супярэчыць самой назве кнігі, дзе напісана ўсё ж такі «свабоднай». З гэтага і пачынаецца актыўнае абмеркаванне. Дзе мяжа паміж жанчынай свабоднай і адзінокай?

Калі пісьменніца мае такую смеласць і гатова «агаліцца» перад чытачамі ва ўсіх, нават не самых прыгожых момантах свайго жыцця, то да гэтага хочацца ставіцца з павагай.




Немагчыма крытыкаваць чужую праўду ў такой інтымнай тэме. Складаецца ўражанне, што табе даверылі вялікую таямніцу, з якой трэба абыходзіцца асцярожна.

Непрыхаваная аўтабіяграфічнасць, падкрэсленая адкрытасць душы дадае эмацыянальнасці кнізе. Варта помніць, што гэта не лірычная гераіня ідзе на спатканне чарговым кавалерам, а сама Ганна Чыж-Літаш.

У яе жыцці ёсць усё, аб чым марылася: свой дом з вялікім ложкам і прыгожымі крэсламі, любімая дачка ад папярэдняга шлюбу. Аднак адсутнасць мужчыны абнуляе, прыніжае каштоўнасць папярэдніх здабыткаў.

У 34 гады гераіня ізноў на поле бітвы, дзе перамога — новы шлюб. Яна адчайна рыхтуецца да кожнага змагання — абцасы, памада і далей па спісе. Але чарговы мужчына не атрымлівае ад пісьменніцы больш за адну главу.

Асаблівым стане толькі адзін. Яго псеўданім ці сапраўднае імя пазначана і ў прысвячэнні кнігі: «Містар І. Дзякую за тое, што навучыў мяне быць сапраўднай».

Не здольны ў сталым узросце мужчына на сур'ёзныя адносіны, ён прапануе застацца ў свабодных. Містар І пакідае паміж імі выцягнутую руку. Дзеля таго, каб сысці, як толькі яна паспрабуе наблізіцца.

У псіхалогіі для гэтага ёсць азначэнне: тып сімпатыі, які пазбягае. Пісьменніца гэта разумее. Ганна Чыж-Літаш смела дзеліцца сваім досведам працяглай псіхатэрапіі.

У кожнай гісторыі ўзровень болю і непрыняцця зашкальвае. Перад чытачом выразна паўстае жаноцкасць, параненая і пакалечаная папярэднім досведам. Яна крычыць аб жаданні вылечыцца.

Такім чынам і адбываецца трансфармацыя галоўнай гераіні. Ад поўнага неразумення, чаму той самы не знаходзіцца, да пэўнага павароту да сябе.

Ні адзін чалавек не зможа знайсці сапраўднае каханне, калі ў яго няма любові да сябе. Перадаваць адказнасць за ўласнае развіццё чалавеку, які прычыніў столькі болю, сапраўдны мазахізм. Жанчына, якая можа сабраць сябе наноў пасля таго, як ёй разбілі сэрца, — моцная і мае права сама быць прычынай свайго шчасця.

Кніга чытаецца лёгка, але мае адзін сур'ёзны недахоп: не дае прасторы для надзеі. На старонках мы сустракаем каля тузіна розных мужчын. Аднак ніводзін не пакідае добрага следу.

«Мужчынам у дзяцінстве нельга гуляць у лялькі Барбі, і яны гэта ўвасабляюць у дарослым жыцці» — лейтматыў усяго рамана. Сталыя жанчыны пагодзяцца з напісаным, а маладыя спалохаюцца таго, што іх чакае.

**Яна ЦЭГЛА**

**Шкада, што не выходзяць на беларускім матэрыяле кнігі кшталту «Крылатыя словы і выслоўі», як гэта практыкуецца, напрыклад, у Расіі. Карысць ад іх была б вялікая. Асабліва калі сабраны выказванні знакамітых пісьменнікаў, навукоўцаў, знаных прадстаўнікоў іншых галін творчасці, а таксама навукоўцаў, грамадскіх дзеячаў. У шмат каго з іх можна напаткаць выразы, якія даўно набылі вядомасць, а асобныя настолькі папулярныя, што ўспрымаюцца як народныя. А паколькі такіх кніг у нас няма, нярэдка сам знаходзіш тую ці іншую вобразную жамчужыну. Часам гэта адбываецца выпадкова. Цікава яшчэ і тое, як нечакана даведваешся пра паходжанне таго, што чуў неаднойчы, бо яно даўно стала прымаўкай.**

# Адкрыццё Бе[ларусі] праз фальклор

КНІЖНЫ СВЕТ СЕРАДА

Так атрымалася са мною, калі не адзін дзясятак гадоў назад трапіў мне ў рукі зборнік «Сказки и рассказ[ы] белорусов-полешуков». Выданне [...] даўно стала бібліяграфічнай р[...] паколькі пабачыла свет яшчэ ў [...] дзе. Кніга цікавая ўжо тым, ш[то] першы з трох зборнікаў вусна[...]тычных твораў беларускага на[...] запісаных выдатным фалькларыст[ам,] этнографам, публіцыстам Аляксандра[м] Сержпутоўскім.

Чытаючы яго, атрымліваеш тую дзівосную эстэтычную асалоду, без якой не абысціся, калі знамішся з аўтэнтычным фальклорам. А зборнік гэты, хоць і не вельмі аб'ёмны, — сапраўдны скарб вусна-паэтычнай творчасці. Ён умясціў у сябе 80 казак ці твораў, блізкіх да іх па змесце. У іх шчодра паўстае фантазія народа, адчуваецца смелы палёт думкі, прывабнівае вобразная насычанасць мыслення тых безыменных аўтараў, якія некалі гэтыя сюжэты перадавалі з пакалення ў пакаленне. І, безумоўна, апавядальнікаў, дзякуючы якім найлепшыя ўзоры гэтага жанру не згубіліся ў імклівай плыні часу. А іх прозвішчы Аляксандр Казіміравіч заўсёды называе. Атрымліваецца, кожная казка ў пэўнай ступені і аўтарская.

Асабліва зацікавіла мяне адна з іх — «Кузьма», якую Аляксандру Сержпутоўскаму паведаў вядомы казачнік Іван Азёмша. Твор гэты павучальны, з вялікім выхаваўчым эфектам, у нечым нават прыхавана дыдактычным. Сюжэт, праўда, асаблівай арыгінальнасцю не вызначаецца. У аснове — гісторыя з паўсядзённага сялянскага жыцця. Але гэтага дастаткова, каб задумацца, як яно дае важныя ўрокі таму, хто не прывык шанаваць старэйшых, а ў сваёй ўсёдазволенасці даходзіць да таго, што не слухае нават роднага бацьку.

Жыў селянін, Кузьмой якога звалі. Чалавек спакойны, добры, а ў нечым і слабахарактарны. На такіх часам глядзяць пагардліва, не заўсёды ўспрымаюць усур'ёз. Так атрымалася і з Кузьмой. Спачатку жонка яго абражала як магла. Ды і сын, беручы з яе прыклад, да блізкага яму чалавека ставіўся як да кагосьці чужога ў хаце. А маці яшчэ падвучыла яго не бацькам зваць, а па імені. Кузьма ж з-за свайго пакладзістага характару звыкся.

Іначай да гэтага адносіліся суседзі. Параілі ўсур'ёз узяцца за выхаванне жонкі і асабліва сына. Маўчыць Кузьма, разумее, што яны толькі дабра яму жадаюць. Ды ніяк не асмельваецца паставіць на месца і жонку, і сына.

Хто ведае, колькі б гэта працягвалася, калі б не паехаў неяк з ім па сена. А стагі знаходзіліся на балоце, ведама якая дарога. Калі вярталіся дамоў, воз, на якім ехаў сын, перакуліўся, падмяў яго пад сябе. Як ні стараўся ён, вылезці не мог. Пачаў прасіць: «Кузьма, падымі воз, а то загіну». Маўчыць бацька, нібы яго гэта і не тычыцца. Дастаў люльку, выняў з кішэні капшук з тытунём і курыць спакойна. «Ляжы, — думае, — калі не хочаш мяне бацькам назваць». А сын ужо ледзь жывы. «Кузьма!» — з апошніх сіл крыкнуў ён і тут жа спахапіўся: «Бацька, падымі воз!»

Што адбылося далей, цытую па арыгінале: «Рад Кузьма, што сын назваў бацькам, падняў воз і аслабаніў сына. Падняўся дзяцюк, абтрапаў снег ды й кажэ: "На [...] [...]ывеш [...]гату, шукаць [...]Сказки и расска[зы белорусов-по]лешуков» 1911 года не [...]днасці. Толькі што ў серыі [«Беларускі] кнігазбор», што апошнім [...] выходзіць у выдавецтве «Беларуская навука», пабачыў свет аднатомнік «Выбранае» Аляксандра Сержпутоўскага (укладанне і каментарый Уладзіміра Касько і Кастуся Цвіркі). Яго адкрываюць матэрыялы з гэтай аднoй з найважнейшых яго прац.

Хоць, калі разабрацца, у творчасці Аляксандра Казіміравіча нічога выпадковага не было. Ён працаваў мэтанакіравана і плённа (на яго рахунку — 45 друкаваных прац), адкрываючы Беларусь праз багаты нацыянальны фальклор, пры гэтым, як сведчыць кандыдат філалагічных навук Уладзімір Касько, «характэрнай рысай Сержпутоўскага-вучонага было тое, што ён умела спалучаў у сваёй працы акадэмічнае даследаванне з надзённымі задачамі, праблемамі будаўніцтва беларускай нацыянальнай культуры. Шырокае кола навуковых інтарэсаў, актыўная грамадзянская, жыццёвая пазіцыя — усё гэта паставіла Аляксандра Казіміравіча Сержпутоўскага ў першыя шэрагі выдатных беларусазнаўцаў, якімі па праве ганарыцца народ».

Уладзімір Касько даўно займаецца вывучэннем жыцця і творчасці Аляксандра Сержпутоўскага, аб чым сведчыць яго кніга «Святло далёкай зоркі» (ёсць, дарэчы, і даследаванне Васіля Бандарчыка і Анатоля Фядосіка «А. К. Сержпутовский»), перавыданне ў беларускіх выдавецтах — колішнім «Універсітэцкае» і «Вышэйшая школа» — некаторых яго прац, а да «Выбранага» ён напісаў прадмову «З думай пра Беларусь».

Як таго і вымушаюць уступныя артыкулы, гэта — сціслая жыццёвая і даследчыцкая біяграфія аднаго з тых, чыя «літаратурная, асветніцкая, навуковая спадчына з'яўляецца каштоўнай крыніцай пазнання духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа». Аднак чытач, які хоча ведаць пра Аляксандра Сержпутоўскага як мага больш, усё ж спатоліць сваю прагу пазнання як навукоўца. Шмат дадуць і згадкі, прыведзеныя ў прадмове.

Прынамсі, інфармацыя пра рукапісны зборнік «Пословицы и поговорки белорусов». Ён стаў вынікам шматгадовай працы Аляксандра Казіміравіча над збіраннем і запісам прыказак, прымавак, выслоўяў і іншых жанраў народнай фразеалогіі. Наколькі была праведзена вялікая збіральніцкая работа, сведчыць тое, што ў яго ўвайшло 10 тысяч тэкстаў. Ды яшчэ дадатак, а гэта 158 старонак машынапісу, у якім прыводзіліся значэнне асноўных слоў і выразаў. Аддзяленне этнаграфіі Расійскага геаграфічнага таварыства за гэты зборнік прысудзіла Аляксандру Сержпутоўскаму малы залаты медаль, а Інстытут беларускай культуры збіраўся выдаць яго ў 1926 годзе. Аднак ён так і не выйшаў. Па якой прычыне, невядома па сёння.

Толькі і твораў, змешчаных у аднатомніку, дастаткова, каб упэўніцца, як шмат зроблена Аляксандрам Казіміравічам па прапагандзе нацыянальнага фальклору. У раздзеле «Казкі і апавяданні», апроч ужо згаданых твораў са зборніка 1911 года выдання, прадстаўлены і «Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета». Ёсць таксама раздзелы «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» і «Этнаграфічныя нарысы, артыкулы».

Кожны з іх цікавы, у кожным прысутнічаюць арыгінальныя творы. Але этнаграфічныя матэрыялы вылучаюцца асаблівай навізной. Між іншым, у свой час

з імі Аляксандр Сержпутоўскі выступаў у часопісе «Живая старина» і іншых навуковых выданнях Расіі, з'яўляючыся пастаянным аўтарам рубрыкі «Очерки Белорусии». Пісаў па-руску, але, каб чытач атрымаў найбольш поўнае ўяўленне, як гучыць у арыгінале пэўнае паняцце, назвы падаваў па-беларуску. Дзякуючы яму, ва ўжытак увайшлі дагэтуль невядомыя расійскім навукоўцам, а тым больш прыхільнікам беларускай даўніны за яе межамі, паняцці «сябрына», «бонда», «талака», што сталі назвай асобных публікацый.

Нарыс «Сябрына» — першы з гэтай серыі, быў апублікаваны ў «Живой старине» ў трэцім выпуску за 1907 год. У ім Аляксандр Сержпутоўскі паведаў пра старажытныя традыцыі беларусаў-палешукоў гістарычнай Случчыны, дарэчы, сваёй малой радзімы — нарадзіўся ён у вёсцы Бялевічы Слуцкага павета. Пры гэтым не пагадзіўся з Іванам Насовічам, які сцвярджаў, што ў беларускай мове слова «сябрук» нічым не адрозніваецца ад блізкага яму «сябра».

На думку Аляксандра Казіміравіча, «сябра» — чалавек, роднасны каму-небудзь па духу. У асобных выпадках ён можа быць нават бліжэйшы за родзіча. «Сябрына» выкарыстоўвалася ў тых выпадках, калі якую-небудзь справу лепш весці сумесна. Найбольш характэрны прыклад бачыў у пчалярстве, на той час вельмі распаўсюджаным на Палессі.

Рой пчол часам пералятае ад гаспадара да гаспадара. Сяляне пры гэтым не спрабавалі абавязкова вярнуць іх назад. Наадварот, пачыналі сумесна займацца бортніцтвам, бо, па мясцовых павер'ях, падобныя пералёты — праяўленне Боскай ласкі. Да пчалы палешукі таксама ставіліся як да свяшчэннай істоты.

На Палессі Аляксандр Сержпутоўскі даведаўся і пра звычай, звязаны з пчоламі, які ў іншых рэгіёнах Беларусі не напаткаеш. Пры стварэнні новай сям'і маладым дарылі вуллі. Тым самым сябрына яшчэ больш умацоўвалася. Тыя, хто меў да яе дачыненне, з асаблівай павагай ставіліся адзін да аднаго і ў гаворцы звярталіся толькі на «вы». Калі ўзнікала неабходнасць, прыходзілі на дапамогу. Ніколі не сварыліся, таму што сваркі, звягі ўспрымалі вялікай ганьбай.

Сябрамі станавіліся і тады, калі ад кароў, авечак ці кабылы, падораных у час вяселля, з'яўляўся прыплод. Узрадаваныя сяляне прамаўлялі: «Ідзе ў руку!» Тыя палешукі, якія былі найбольш кампанейскія, а па характары добрыя, стараліся займець пабольш сяброў. Пра выгоду не думалі, але яе ўсё ж атрымлівалі, бо сябра сябар ніколі не пакідаў у бядзе. Таму і з'явіліся такія прыказкі, як «Шмат сваіх, ды чорт на іх, а сябар — божы сваяк», «Не май асьмякоў, а май лепш сяброў — неяк пражывеш і з голаду не памрэш».

По-свойму паставіўся Аляксандр Казіміравіч і да паняцця «талака». Ён аспрэчыў меркаванне Уладзіміра Даля, што «талака — работа грамадой за пачастунак». Праца талакой, у чым ён неаднаразова пераконваўся, праводзілася бескарыслівa і бясплатна. Звычайна ёю сяляне карысталіся, калі неабходна было зрабіць тое, плёнам чаго карысталася ўся грамада. Талакой капалі студні, будавалі лазні, узводзілі плаціны, насыпалі грэблі. У гэты час прыглядаліся да чалавека. Хацелі ўпэўніцца, наколькі ён рупны, працалюбівы. Пасля стаўленне да кожнага было адпаведнае. У прыватнасці, як сцвярджаў Аляксандр Сержпутоўскі, «лёс беларускай дзяўчыны ў большасці выпадкаў залежаў ад таго поспеху ў працы, якім яна зарэкамендавала сябе ў талацэ».

Аднак і ён, не згаджаючыся з Уладзімірам Далем, усё ж мусіў прызнаць адзінкавы выпадак талакі за пачастунак. Гэтую бескарыслівую традыцыю парушалі паны, калі ім трэба было ў сваіх інтарэсах прыцягнуць сялян на якуюнебудзь важную работу. Пасля завяршэння тыя, хто аказаў помач, шчодра аддзячваліся гарэлкай.

Расказаў Аляксандр Казіміравіч і яшчэ пра адзін звычай, які па сёння не страціў сваёй адметнасці. Называецца ён «бонда». Звязана гэтая традыцыя была з тым, што палешукі ахвотна дзяліліся рыбай, мёдам, мясам і іншымі здабыткамі сваёй працы з суседзямі, а то і проста аднавяскоўцамі. Гэта і называлася «бондай». Былі ўпэўнены, што калі забудуць пра бонду, ці, інакш кажучы, бондачку, то іх напаткаюць розныя напасці. Бондай адорвалі не толькі адзін аднаго. Заўсёды стараліся накарміць бадзяжную жывёлу, памятаючы: «Бог дае на ўсіх долю. І сабаку давай кавалак хлеба — можа, не пра чыю ласку жывём». Аляксандр Сержпутоўскі меркаваў, што пачатак «бонды» — у сівой даўніне, калі людзі жылі яшчэ абшчынай. Ён сустракаў на Палессі тых, хто бясплатна апрацоўваў зямлю сялянам-беднякам. Такія дабрадзеі дзяліліся апошнім, калі ў суседа быў неўраджай ці не хапала хлеба да новага.

З этнаграфічных матэрыялаў — пазнавальны «О завитках в Белорусии». Па-беларуску — залом, завітка, закрутка. Так называлі пук заблытаных, заламаных ці завязаных вузлом сцяблоў жыта альбо травы на сенажаці. Гэта ўспрымалася закляццем, ад якога, каб не мець непрыемнасцей, трэба абавязкова пазбавіцца. Дарэчы, у пісьменніка Лявона Лобіка з Капыльшчыны ёсць апавяданне «Залом у жыце», чаго Аляксандр Казіміравіч, канешне, ведаць не мог. Але гэты факт таксама сведчыць на карысць таго, што ён пільна прыглядаўся да жыцця беларускага народа, адлюстроўваў, якое, распаўсюджанае ў пэўнай мясцовасці, аднак характэрнае і для іншых рэгіёнаў.

Аляксандр Сержпутоўскі сапраўды жыў і працаваў з думай пра Беларусь. Пры гэтым памятаў, што больш упэўнена можна глядзець у дзень заўтрашні, добра ведаючы сваё мінулае. Сімвалічна, што яго «Выбранае» з'явілася ў серыі «Беларускі кнігазбор» у Год гістарычнай памяці. Яно таксама адказвае на пытанне, хто і адкуль мы.

**Язэп ЛІТВІНОВІЧ**

# «Пакажы мне жыццё...»

**Існуе меркаванне, што інтэрнэт, тэлебачанне канчаткова адвярнулі моладзь ад чытання мастацкай літаратуры. Што ж, у пэўным сэнсе такі момант, на жаль, ёсць, але маюць месца і іншыя прыклады. А менавіта маладыя людзі, якія не толькі чытаюць прозу, паэзію, але спрабуюць і самі ствараць мастацкія творы. І адным з месцаў, дзе збіраюцца такія дзяўчаты і хлопцы, стаў літаратурны клуб «Катарсіс» Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Створаны ў 1999 годзе, ён працягвае па сёння збіраць пад сваім дахам таленавітую моладзь, дапамагае навучыцца правільна і якасна пісаць вершаваныя, празаічныя і драматургічныя творы. За гэты час выдадзены чатыры калектыўныя літаратурныя зборнікі, будучыя дактары друкаваліся ў газетах «Эскулап», «Гродзенская праўда», «Вячэрні Гродна», часопісе «Маладосць». Пастаянна ўдзельнічаюць у розных літаратурных конкурсах, і досыць паспяхова. А ў апошнім Рэспубліканскім літаратурным конкурсе «Аўтограф-20» атрымалі ажно 12 дыпломаў пераможцаў і прызёраў, што стала своеасаблівым рэкордам сярод ВНУ краіны. Студэнты прымалі ўдзел у Дні беларускага пісьменства ў Слоніме, V кніжным фестывалі «Гарадзенскі літфэст», часта выступаюць перад універсітэцкімі і школьнымі аўдыторыямі. На працягу 10 гадоў праводзіцца адкрыты літаратурны конкурс клуба «Катарсіс», у якім ахвотна прымаюць удзел аўтары з усіх куткоў Беларусі, а таксама Расіі, Польшчы, Германіі. І зараз мы хацелі б прадставіць вершы некаторых нашых аўтараў.**

**Віктар ВАРАНЕЦ,**
**кіраўнік літаратурнага клуба «Катарсіс»**

## Арцём ПОЛУДЗЕНЬ

### Буслы

*З хваляваннем, з пяшчотаю мілаю*
*(Пачуццё як сваё перадаць?)*
*Назіраю штогод я, як з выраю*
*Зноў буслы на радзіму ляцяць.*

*Вось ляцяць над знаёмай мясцінаю,*
*Над палеткамі водзяць кругі.*
*Зноў спатканне з любімай Радзімаю,*
*Сустракае іх край дарагі.*

*Тут заўжды і паветра духмянае,*
*І бярозавы гай, і лугі,*
*Так знаёмае ўсё і жаданае,*
*Тут няшчасняў няма і тугі.*

*Клёкат птушак мне песняю шчыраю,*
*З ім не страшны любы пратрус,*
*Калі бусел вяртаецца з выраю,*
*На святую зямлю — Беларусь!*

## Дзіяна ТРАЦЦЯК

### Пакажы мне жыццё

*Пакажы мне жыццё дасканалае,*
*Што чакаем, нібы дару Божага.*
*Што ні разу нікім не зламанае,*
*Не парушана сілай варожаю.*

*Пакажы мне жыццё, таго вартае,*
*Каб пражыць яго і не саромецца*
*Ні прад продкамі, ні прад нашчадкамі*
*За ўсё тое, што намі тут робіцца.*

*Пакажы мне жыццё больш сапраўднае,*
*Чым гайсанне між працай і хатаю.*
*Тэлевізарам не змарнаванае,*
*Не разбітае бутэлькай праклятаю.*

*Ды не зваліцца з неба, як марыце,*
*Ні багацце, ні шчасце, ні рацыя.*
*Бо жыццё — што вы самі ствараеце*
*Сэрцам, розумам, плённаю працаю!*

## Юлія ШАЎКОВІЧ

* * *

*Ты глядзіш у люстэрка з прыкрасцю.*
*Засталося ці што там ад годнасці?*
*За вачэй халоднай блакітнасцю,*
*за чужою нахабнай істотнасцю,*

*за той мовай, што з вуснаў зрываецца,*
*што таксама не наша, пазычана.*
*Наша з болем душы адгукаецца,*
*бо забыта амаль, абязлічана.*

*Тое дзе, за што продкі змагаліся?*
*І чаму мы ў пекла так гонімся?*
*Хто мы, дзе мы, і што з намі сталася?*
*Ці абудзімся мы, ці апомнімся?*

*Дзе яна, дзе душа беларуская? —*
*Льецца ў сэрца мне матчынай песняю.*
*Б'ецца ў грудзі спалоханай птушкаю.*
*Знічкай белай лунае над безданню.*

*З абраза вочы сочаць у покуці.*
*А патэльня абудзіцца шкваркаю.*
*Смех гучыць у маланкавым грукаце.*
*Нашы беды сплывуць лёгкай хмаркаю.*

*Паглядзім у люстэрка з надзеяю.*
*І без зайздрасці, і без прыкрасці.*
*Беларусы заўжды жылі з вераю,*
*З добрым сэрцам, душэўнаю літасцю.*

## Караліна МАКАВЕЦКАЯ

* * *

*Зямлёй і людзьмі рухае дух змагання.*
У. Караткевіч
«Каласы пад сярпом тваім»

*Стрэлы гучаць, як раскаты грымотаў.*
*Жудасны кліч:*
*«Касінеры, наперад!»*
*У кашулях, пашарпаных ботах*
*Выйшлі біцца за праўду і веру.*

*Зброя сялянская, у страўніках пуста.*
*Гэта не армія, а самагубства.*
*Толькі малітва зрываецца з вуснаў.*
*Смерці баяцца? Сапраўднае глупства.*

*Так збажына не кладзецца ад граду,*
*Як на пабоішчы падаюць людзі:*
*Так дакрануцца хацелі да праўды —*
*Ды на зямлю,*
*на халодныя грудзі…*

*І разбіваюцца горкія лёсы —*
*Слава героям як мужнасці сімвал!*
*Плачуць над імі спрадвечныя сосны,*
*Бой — не гульня,*
*а харугва — не вымпел.*

*Толькі малітва кранаецца вуснаў.*
*Зброя сялянская, ў страўніках пуста.*
*Смерці баяцца —*
*сапраўднае глупства.*
*Подзвіг народа, не самагубства…*

## Лізавета БАЗЫЛЬЧЫК

### Зямля бацькоў

*Люблю зямлю сваіх бацькоў,*
*Яе дубровы і лясы.*
*З паважнай веліччу зброў*
*І сцежкай, мокрай ад расы.*

*Люблю гаючы смак крыніц,*
*Магутнасць волатаў-дубоў.*
*І павуцінку, што ляціць,*
*І водар восеньскіх грыбоў.*

*Жывуць тут людзі ў дабрыні,*
*Шырокай, шчыраю душой,*
*Зямлі адданыя сыны*
*Маёй Радзімы дарагой!*

## Алена ЛОЎЧАЯ

### Меркаванне

*З узростам прыходзяць веды,*
*А з вопытам — веды душы.*
*Жыццё ж — не кавалак крэйды —*
*Сцірай і зноўку пішы.*

*Малыя прагнуць узросту,*
*Хутчэй каб беглі гады.*
*Здаецца, дарослым быць проста,*
*Праблемна быць маладым…*

*Ва ўсіх ёсць толькі здагадкі,*
*Не ведаем, што далей.*
*Калі ж нас стварылі такімі,*
*Давайце туліцца бліжэй!*

*Хутчэй расчыняйце дзверы,*
*Склікайце ў хату гасцей,*
*Паболей любові і веры —*
*Дарыце для добрых людзей!*

## Таццяна КРУПІЦА

### Беларусь

*Раніцай пахне у полі травою,*
*Нёман лагодную песню пяе.*
*Сонца ўстае над радзімай зямлёю*
*І асвятляе пяшчотна яе.*
*Дзесьці зязюля кукуе ў лесе,*
*Бусел над вёскай лунае маёй.*
*Вецер-гарэза шуміць на Палессі,*
*Белыя чайкі ляцяць над Дзвіной.*
*О Беларусь, дарагая Радзіма,*
*Край незабыўны, табой ганаруся.*
*Ў сэрцы маім ты каханне адзінае,*
*Слаўная, мілая Белая Русь!*

## Марыя САЛОМКА

### Жнівеньскі вечар

*Пахне чаборам жнівеньскі вечар,*
*Дзесьці камарыкаў чуецца звон.*
*Я так ляцела на нашу сустрэчу…*
*Ты прыцягнуў свой любімы айфон.*
*Нам паблукаць бы з табой*
*па сцяжынах,*
*Каб захапіла каханне ў палон.*
*Сядзь жа бліжэй ты да любай*
*дзяўчыны…*
*Не, ён гартае любімы айфон.*
*Вечар той ў памяці не, не сатрэцца:*
*Ён для мяне як апошні патрон.*
*Хай гэты дурань адзін застаецца*
*І пацалуе любімы айфон…*

## Тамара ТАЛКАЧОВА

* * *

*Буяюць ля хаты вяргіні,*
*Махрацца вясёлкаю астры,*
*Павоі ўзняліся ў вышыні,*
*Нібыта ў палацах пілястры.*

*Ды гэтая пышная квецень —*
*Штрышок развітальны прыроды*
*Ці мо напамінак аб леце?*
*Пусцеюць сады і гароды...*

*І птушкі сабраліся ў вырай,*
*І лісцейка з дрэў ападае.*
*І восень,*
*з усмешкаю шчырай,*
*Апошнім цяплом нас вітае.*

* * *

*Восень кружыць і кружыць*
*Залатою лістотай*
*Пад акорды няўсцешнай*
*Жураўлінай тугі.*

*Ахінаючы сэрца*
*Няўсцешнай самотай,*
*Запаўняе пяшчотай*
*Душы берагі.*

*І пякучая горыч*
*Пары развітальнай,*
*І гаючая слодыч*
*Загадкавых дзён*

*Разліваецца морам*
*І гукаў, і фарбаў —*
*І гучыць над зямлёю*
*Яе перазвон.*

## Павел КАРАЛЁЎ

* * *

*І ўсё ж Яму не ўсё адно...*
*Не абыякавыя лёсы,*
*І знак дае, ды бярэжэ,*
*І выратоўвае праз слёзы.*
*Здаецца, знікне зніч надзей,*
*Падасца марным бессэнсоўнасць...*
*А хтосьці грукае мацней*
*І сведчыць блізкае — бясконцасць...*

* * *

*Нехта смажыць*
*на патэльні азёр*
*Ранкам летнім*
*У тумане бялюткім...*
*Край чароўны!*
*Ты пакажаш паўнютка*
*Зоры зноў, што народзяць*
*Любоў...*

* * *

*Не свету гэтага*
*трымацца,*
*А з далечы...*
*Свой шлях ісці,*
*Як сведка той Сустрэчы.*

# Абразкі



Вітаўт ЧАРОПКА

* * *

Танклявыя доўгія пальцы трымаюць мабілу. Яна на сувязі з кімсьці. Выгіб усмешкі на вуснах, адказ на прыемныя словы. За шкельцамі акуляраў іскрыцца радасць у вачах. Яна такая далёкая ад мяне — невядомая і маладая. Пасярод вечаровых агнёў мы едзем дадому, што нас яднае на кароткае імгненне, пакуль яна не выйдзе на сваім прыпынку. Я стомлена заплюшчваю вочы, не хачу бачыць людзей. А душу каламуцяць смутныя думкі, што дома мяне чакае адзінота і пустыя нудоты. Усё ж я заўважыў, што сёння быў сонечны дзень. І гэта цудоўна! Магчыма, і адзінота мае сваю мудрасць, якая дае разуменне каштоўнасці кожнага імгнення. Як праз горлачка пясочнага гадзінніка знікаюць імгненні — адно за адным — і ўсё менш іх застаецца на маім рахунку часу. Можна пашкадаваць страчаныя імгненні, а можна даражыць тымі, што яшчэ засталіся, бо з імі мой час яшчэ не выйшаў. Радавацца сонечнаму дню, жаночай прыгажосці і сваёй адзіноце, дзе ты належыш сам сабе, калі ў душы выспяваюць светлыя словы, якія злучаюць цябе з цэлым светам.

* * *

Забыўся словы малітвы, нібыта згубіў іх сэнс і як у тумане вобмацкам прабіраюся да іх існасці, ладжу лад іх існых словазлучэнняў. Так за бегам дзён, за клопатам і справай, за п'яным ачмурэннем жыў без Бога ў душы і не зважаў на яго адсутнасць. Не тое, што патрэбны быў і карцела ўзносіць яму святыя модлы, а так проста жыў без яго. Спадзяваўся на сябе і трошкі на людзей, верыў у лепшае і крыху ў шчасце і неяк перабіваўся з жабрацтва на беднасць, з капейкі на капейчыну, смаліў чужыя недакуркі, даядаў кінутыя недаедкі, даношваў непатрэбныя неданоскі і быў вольным, сам сабе гаспадар і пан. І не патрэбны быў мне Бог, і навошта я патрэбны яму? Калі ў свеце ёсць зло і нягода, іх не выправіць малітвамі і Бог не дапаможа. У сваёй ганарлівасці казаў, што Бога няма. Дык чаму мне захацелася раптам прыгадаць «Ойча наш»? Блытаюся ў словах і фразах, і адно апраўданне — мая наіўная шчырасць. Ахінаю сябе крыжовым знаменнем, так, на усялякі выпадак, каб пазбавіцца смутку і сумненняў за Радзіму.

* * *

Падаюць зоркі на далоні зары. Ты сумна глядзіш ім услед. Ведаю, хочаш нешта сказаць, але маўчыш, і тваё маўчанне мучае маё сэрца. Як шкада, што нельга пацалаваць твой срэбны голас, дакрануцца вуснамі да кожнага яго гуку, адчуць яго трапяткое дыханне і пачуць, як цудоўны спеў, сваё імя, каб зразумець, што я па-ранейшаму дарагі табе. Але тваё маўчанне кажа, што ты ўжо не мая, што ты далёка ад мяне. Адно пачуў: «Няўжо ты не зразумеў, я пайшла ад цябе». Кінутыя на вецер словы, як злая пачвара, душаць мяне, і не стае паветра на гэты суровы вырак твайго сэрца. Срэбны твой голас стаў жалезным і вострым, як меч ката.

Мы расстаёмся назаўжды і, можа быць, ужо не ўбачымся ніколі, і ніколі не пачую твой мілы голас, але і праз гады, праз вечнасць разлукі я пазнаю яго сярод усіх галасоў сусвету.

* * *

Ён не проста асоба, а пакутлівая асоба. Пакутуе за сябе і за ўсіх нас, нават за кволага пінгвіна ў снягах Антарктыды і тое пакутуе. Я слухаю яго пакутныя словы. Сапраўдная пакута не можа быць без сапраўднай пакуты, калі цемра ў вачах, горыч у сэрцы і енчыць душа ад пакуты. А пакуту трэба выпакутаваць і адпакутаваць. Пакутаваць… пакутаваць… Сцішаецца яго голас, і мне не зразумела, навошта трэба пакутаваць і як адпакутаваць, але я згодна маўчу і не спрачаюся. Крый мяне божа, колькі ён адпакутаваў за нас! Але ж колькі мы адпакутавалі з-за яго?

* * *

Ён такі недарэка і даводзіць усім, што ён не недарэка, а лепшы на ўсе рукі майстар, лепшы за найлепшых. А я просты і несамавіты і не пнуся ў найлепшыя.

Фота з сайта bluffton.sun.com

Мне досыць таго, што маю і ёсць. Я гэта стварыў і зрабіў, і хай у вачах іншых яно нічога не вартае, але маё. Толькі вось гэты найлепшы на ўсе рукі майстар працягнуў хцівыя рукі да майго ўбогага набытку. І цяпер ён вяшчае, хай я просты і несамавіты, але ўсё ж на ўсе рукі мастак. Не здзіўлюся, калі выцягне з вашай душы ваша самае запаветнае слова і схавае яго ў скрыню, як скнара Габсек, у завалах сваёй памяці, каб адчуваць сябе ўласнікам усяго ўсякага. А спытайся ў яго, навошта яму ўсё гэта трэба, і ён не адкажа, бо нялёгка быць лепшым за найлепшых, калі гэта патрэбна даводзіць самому сабе.

* * *

Працяты ветрам наскрозь, хоць на дварэ ўжо вясна, чытаю малітву, а на душы усё тая ж маркота. Сёння чорная пятніца — трынаццатае, а значыць, нешта здарыцца благое. Толькі ні бяда, ні катаклізмы не спыняць няўмольнага часу. Заўтра будзе субота, калі можна выспацца ў ахвоту і цікаваць з ложка за сонечным промнем на шыбе. І тады ў пыльным кутку пад столлю ачухаецца нудота, страхне з сябе зімовы сон на стрэлкі часу і пачне нудзіцца і зайздросціць сонечнаму промню, які можа зазірнуць у заўтрашні дзень. Вось так з дня ў дзень мы бяжым ад нудоты ў заўтра, абганяючы свой час.

* * *

Нам застанецца жыць са сваім сумленнем, як з Богам сам-насам, калі былі чыстыя намеры і добрыя ўчынкі. А ў каламутні брудных душ захлынулася сумленне. Няма прэйскуранта кошту нягодніцтва, здрады, злачынства і іншага зладзейства, як і чым расплацімся за свае грахі. Жывём не па сумленні, жывём па блатных паняццях, жывём самі па сабе на выжыванне. І цяжар грахоў не такі і цяжкі, і нам усё адно, што нам будзе за іх, не пужае нават кляцьба за людскую слязу аж да сёмага калена. Мы, як на нічэйнай паласе, паміж Богам і чортам, і маўклівае сумленне не падкажа, дзе дабро, а дзе зло.

* * *

Здаецца, трэба нешта зрабіць, толькі варта вырашыць, што гэта за нешта і з якой нагоды і чаму нешта трэба зрабіць. І застаецца спакойна век свой дажываць. Па-старэчаму бурчаць на сучасныя норавы і мадэрновую мараль. Казаць, што мы былі не такія, гулялі ў футбол, слухалі рок, чыталі кніжкі верылі ў ідэалы, каханым прысвячалі вершы. Наіўнымі былі і простымі, як існая яснасць. Мы былі такімі, як ёсць, без інструкцый і настаўленняў, і ў гэтым і хавалася наша сутнасць, тое, што вызначыла наш лёс. Цяпер гэта называецца быць «лахом», цяпер не залічваецца за вартасць шчырасць і чуласць. Не верыцца, што мы выраслі такімі — апошняе пакаленне, выхаванае на кнігах.

* * *

Ці прыснілася мне, ці падсвядомае трызненне з далёкага юнацтва — бачыцца дзяўчына ў кароткай спадніцы. За цёмнымі акулярамі хаваюцца яе вочы, і не зірнуць мне ў іх. Каля яе юных ног лашчыцца шчанё. У такую можна закахацца.

І вось на прыпынку ўбачыў яе. У кароткай спадніцы з цёмнымі акулярамі на вачах. Такая з сябе мілавідная, але раззлавана кажа нешта па мабіле. Навошта мы прыдумваем сабе вобразы каханых, надзяляючы іх ідэалам? Яны апаноўваюць нашы сэрцы і выядаюць душу. Вось і гэтая дзяўчына —мілая з выгляду і вульгарная знутры. Не бяда, што вульгарная і злая, затое такая маладая, як кветачка. А маладосць зачароўвае. Вось такую калісьці ў маладосці пакахаў і не дакахаў. Тады яшчэ было рана, а цяпер позна ўжо.

* * *

Прамаўляю малітву да Бога ад непагадзі, хай і нястрашнай, але і непрыемнай. Калі нарэшце з цьмяных хмар выгляне сонца і акрыяе душа? Хочацца нешта зрабіць, можа, нязначнае, але патрэбнае, ці дарабіць недаробленае, што як кол стаіць на двары, стаіць і ні туды і ні сюды доўгі час. Сярод панурых восеньскіх дзён людзі, як цені, знікаюць, і знікае нават сэнс жыцця. Але ў клопатах дня (праца, крама, навіны, вячэра, сон) наступае ноч, і добры намер пераносіцца на заўтра ў чаканні добрага надвор'я.

* * *

Ціш! Гэтая дзівосная ціш непакоіць мяне, нібыта вымер увесь свет, і я застаўся адзін. Нябачная небяспека тоіцца ў цішы, пільна цікуе за мною, вымярае кожны мой крок, каб у зручны час напасці на мяне. Я насцярожана азіраюся. Чысты далягляд, і на небе ні хмурынкі. На пустым шляху — ні слядочка. Ціш навісла пагрозай над галавой, як Дамоклаў меч. Здаецца, мой шэпт прагучыць, як трубны глас, і раскацістым рэхам пракоціцца па закутках свету. Вось моўлю: «Люблю», і наляцяць чорныя здані, і накінуцца на мяне, як чэрці на грэшную душу. «Каго не любіш, што не любіш, навошта не любіш? Мусіш любіць, калі нават ненавідзіш!» Я агаломшаны змаўчу, што я ненавіжу самога сябе, бо гэтая змрочная ціш нараджае страх быць самім сабой.

Страх запаўняе свет, накрывае гарады і вёскі, ахінае свядомасць. Ціш навісае шэрым мроівам і да звону ў вушах гучаць нечыя галасы: «Не люблю!»

* * *

Мімаходзь трапіў у самае пекла, мімаходзь праляцеў над раем і крадком зазірнуў шчасцю ў вочы, як пачуў: «Бывай». Толькі паспеў кінуць: «Пакуль». Вось і бываю. То там недарэка басаногі, а тут ужо шчасліўчык у лапцях. То там багач такі ўвесь з сябе ўдатны, а тут проста небарака, ні на што не здатны. То тут п'янь беспрасветная, то там светлы, як ясны ветах. То там млею ад асалоды, то тут нянавісць з'ядае да костак. То тут сыты адной праўдай, то там адной маной выжываю. Так і бываю па жыцці: то той, то гэты, то там, то тут мімаходзь!

Ды ўсе мы бываем мімаходзь. Нараджаемся мімаходзь, не заўважаем, як выраслі мімаходзь. І замільгала гэтае мімаходзь, аж час завятрыўся у вушах. То там, то тут мімаходзь: кахаем і ненавідзім, працуем і гуляем, плачам і весялімся — і ўсё мімаходзь.

Велічыня нашага жыцця і сэнс нашай існасці — мімаходзь! Хоць і суцяшаем сябе: там нас яшчэ няма, а тут, дзякуй богу, мы пакуль ёсць. Толькі не забывайце: мімаходзь.

* * *

Вось і стукнула нязручная дата — 60 гадоў! У старыя добрыя часы я на пенсіі засеў бы за ўспаміны, які я быў малады і як з надзеяй марыў аб будычыні. Уяўлялася яна такой далёкай, а высветлілася, чакала тут кала адзнакі 60, куды я нарэшце дабраўся. І вось можна нарэшце падвесці вынікі пройдзенага шляху. А чаго тут лічыць гэтыя прыбыткі і страты, згадваць спадзяванні і расчараванні. Перажываць за пустое ці вартае таго. Ужо нічога з былога не вярнуць і не перайначыць. Толькі сорамна, што я быў не такім, як хацеў быць, крыўдна за праяўленую кволасць і баязлівасць, там не ўстаяў, дзесьці прамаўчаў, дзесьці сышоў… А страты выклікаюць скруху. Сталася як сталася, і я стаў такім, які цяпер ёсць.

# «За іх, загінулых, жыву...»

**27 кастрычніка Жабінка прымала першы абласны літаратурны фестываль «Берасцейскае шматгалоссе»**

РЭПАРТАЖ АЎТОРАК

## Дакрануцца да м

Тры даты павінен
кожны жабінкавец:
21 ліпеня — дзень, к
зваленне;
11 верасня — дзень, ка
лёва;
27 кастрычніка — дзень, «само
слова Жабінка выклікала жах».

Гэтак апісаў тую трагедыю пісьменнік Сяргей Смірноў, які паклаў шмат сіл дзеля таго, каб не кануў у нябыт подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Сяргей Сяргеевіч ведаў, пра што пісаў, бо 27 кастрычніка 1942 года ў Жабінцы ды наваколлі амаль няспынна гучалі расстрэльныя каманды, а потым — чэргі з кулямётаў ды шмайсераў.

Таму невыпадкова праз 80 гадоў у Жабінцы ладзіўся першы абласны літаратурны фестываль «Берасцейскае шматгалоссе». У такі памятны дзень паэты і празаікі з розных куткоў Брэстчыны мелі магчымасць дакрануцца да мінулага, прайсці шляхам балючай памяці.

Яны наведалі цікавыя гістарычныя мясціны жабінкаўскай зямлі, пазнаёміліся бліжэй з яе мінулым, увачавідкі пабачылі, як жыве наш край сёння, і пачулі, якім стане неўзабаве.

Найперш чырвоныя гваздзікі ляглі да падножжа помніка ў мемарыяльным комплексе «Драмлёва». Творцы з хваляваннем, неяк асцярожна, нібыта баючыся парушыць спакой загінулых, ступалі па былым паселішчы, дзе стагоддзямі бруяла жыццё. Яно, тое жыццё, раптоўна і назаўжды 11 верасня 1942 года перарвалі карнікі, якія прынеслі з сабой сапраўдны Галавасек. Пісьменнікі слухалі пра лёсы драмлёўцаў і, было відаць, ледзь стрымлівалі слёзы па «вогненнай вёсцы».

Затым было знаёмства з выстаўкай, прысвечанай генацыду беларускага народа, у раённым гісторыка-краязнаўчым музеі, размешчаным у Малых Сяхновічах. Яго залы захоўваюць памяткі не толькі пра Драмлёва, але і сведчанні, сабраныя пракуратурай раёна, якая займаецца пошукам слядоў злачынстваў, пакінутых акупантамі на жабінкаўскай зямлі, — у Ракітніцы, Стрыганцы, Рагозне, колішняй Ацячызне, іншых населеных пунктах.

Апошняй кропкай хвалюючага падарожжа стала Жабінка. Тут, на вуліцы Міру, дасюль беражліва захоўваюцца памяткі аб вайне. Нездарма літаратурны фестываль быў меркаваны да сумнага юбілею, калі ў райцэнтры разыгралася трагедыя. Падчас яе ўсяго за суткі нямецка-фашысцкія карнікі расстралялі і закатавалі, у тым ліку пахавалі жывымі, прыблізна паўтысячы чалавек, у асноўным — жанчын і дзяцей з усходніх рэгіёнаў Савецкага Саюза. Берасцейскія паэты даведаліся, што ажно чатыры помнікі ў сённяшняй Жабінцы сведчаць пра тое зладзейства: адзін — на вуліцы Сцяброўскай і тры — на вуліцы Міру. Самы выразны з іх — жанчына, якая трымае на руках дзіця. Яны нібыта патрапілі ў «павуціну» аўтаматнага прыцэлу за нейкую хвіліну да рэзкай каманды: «Фоер!»…

Творцы адчулі і пабачылі: наш утульны, мірны, квітнеючы горад свята аберагае гістарычную Памяць. А юныя чытачы ўпэўніліся, наколькі кранаюць душу і сэрца вершы ў выкананні аўтараў. Бо паэт можа распавесці пра самыя трапяткія тэмы надзвычай выразнымі сродкамі.

Так, далёка не кожны дзень урок праводзяць пісьменнікі. 27 кастрычніка гэта адбылося ў гарадскім ліцэі, першай і трэцяй школах, куды завіталі ўдзельнікі «Берасцейскага шматгалосся». Трэба было бачыць, як не хацелі пяцікласнікі-«чамучкі» адпускаць з актавай залы СШ № 3 прадстаўніц «паэтычнага цэху»; наколькі зацікавіла сустрэча з «жывымі пісьменнікамі» вучняў першай гарадской; як блізка былі слёзы ў вачах ліцэістаў, калі гучалі вершы, прысвечныя вайне…

*Старшыня Жабінскага райвыканкама Вадзім Краўчук і пісьменнік Анатоль Бензярук.*

Такія імгненні нельга зрэжысіраваць. Нездарма на ўрачыстасці, што распачалася праз гадзіну ў ГДК, вядучай была прадстаўніца ліцэя Аляксандра Скарына — аднафаміліца беларускага першадрукара.

## Зямля берасцейская — край шматгалосы

Святочна ўпрыгожаны гарадскі Дом культуры а 15-й гадзіне шырока расчыніў дзверы перад удзельнікамі «Берасцейскага шматгалосся». Набліжалася ўрачыстая частка першага абласнога літаратурнага фестывалю. У абрамленні цудоўных мелодый, якія літаральна ліліся ў выкананні музыкантаў з дзіцячай школы мастацтваў, гасцей сустракала багатая і разнастайная кніжная выстаўка, арганізаваная жабінкаўскімі бібліятэкарамі. Тут прадставілі творы пісьменнікаў Брэстчыны, у тым ліку тых, хто быў на свяце: Зінаіды Дудзюк з горада над Бугам, Міколы Антаноўскага з Пружан, нашага земляка, ураджэнца вёскі Баранцы Анатоля Брытуна ды іншых.

Удзельнікаў фестывалю шчыра віталі на нашай зямлі. Яны даведаліся, што Жабінкаўшчына — надзвычай самабытны край, багаты на творчыя таленты. Яна падаравала свету вядомага гісторыка і фалькларыста Юльяна Крачкоўскага, выбітных паэтаў Альбіна Дзяконскага, Уладзіміра Кітаеўскага і Васіля Гадульку, дасюль радуюць чытачоў сваёй творчасцю мясцовыя творцы Іван Арабейка і сямейны тандэм Бензерукоў. З Жабінкай шчыльна звязаны жыццё і творчасць паэтаў Івана Кускевіча, Алеся Каско, Васіля Сахарчука. Штогод пісьменнікі радуюць нас сваімі творчымі набыткамі, але сёлета, у Год гістарычнай памяці, брэсцкіх пісьменнікаў аб'яднала адна балючая тэма, звязаная з генацыдам беларускага народа.

Пра тое ў віншавальнай прамове згадаў старшыня райвыканкама Вадзім Краўчук, які расказаў, як сёлета святкаваліся 80-я ўгодкі драмлёўскай трагедыі і разам з тым паступова абнаўлялася вуліца Міру. На ёй паўсталі шматпавярховыя дамы і пачаў развівацца сучасны мікраён, былі адрамантаваны будынкі суда ды Жабінкаўскага раёна газазабеспячэння, а літаральна месяц таму за некалькі крокаў ад помніка на вуліцы Міру ўрачыста адкрыўся мост праз рэчку Жабінку. На думку Вадзіма Васільевіча, гэтыя крокі па добраўпарадкаванні невыпадковыя, паколькі існуе повязь паміж мінулым, сённяшнім днём і будучыняй.

Нямала балючых агнявых кропак пакінула ліхалецце не толькі на карце Беларусі, але і ў людскіх сэрцах. Сёння колькасць паселішчаў, знішчаных акупантамі падчас Вялікай Айчыннай вайны, перавышае лічбу ў 9200, на жаль, такіх памятак бяды шмат і на Брэстчыне. Пра тое распавёў пракурор раёна Дзмітрый Марачук.

Была запрошана на сцэну і добры сябар нашай пісьменніцкай суполкі, старшыня праўлення абласнога аддзялення Беларускага фонду міру Лідзія Раманюк. Яна прыгадала пра нядаўнае адкрыццё ў Старым Сяле Школы міру, прэзентавала прыгожа выдадзеныя кнігі, у якіх прадстаўлены вершы, эсэ і малюнкі школьнікаў з Жабінкаўшчыны. Лідзія Мікалаеўна асобна згадала музей пад адкрытым небам у аграгарадку Мухавец, паблізу гасцінічнага комплексу «Лагуна Янтарная», дзе знаходзяцца помнікі савецкім воінам-вызваліцелям, вывезеныя з тэрыторыі Польшчы, калі ўрад краіны-суседкі пачаў пазбаўляцца ад памятак нашага агульнага мінулага.

Сапраўды, не пералічыць трагічных старонак Вялікай Айчыннай… І кожная з іх апалена, на жаль, агнём. На такіх палымяных старонках занатаваны лёсы паселішчаў, знішчаных бясследна. Сясцёр Хатыні ў Беларусі нямала. Памяці «вогненных вёсак» быў прысвечаны паэтычны конкурс, які праводзіла абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі пры падтрымцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама. На «Берасцейскім шматгалоссі» былі падведзены вынікі творчага спаборніцтва «Слёзы сясцёр Хатыні». Конкурс прысвячаўся памяці берасцейскіх вёсак, спаленых катамі ў агнявыя саракавыя. Пераможцы і прызёры атрымалі дыпломы і падарункі з рук старшыні абласной пісьменніцкай суполкі Таццяны Дземідовіч. Таццяна Анатольеўна таксама выказала словы шчырай удзячнасці за дапамогу і падтрымку кіраўніцтву нашага раёна, якое пасадзейнічала, каб першы абласны літаратурны фестываль прынёс свой плён і стаў прыкладам для наступных «шматгалоссяў».

## Натхненне раскрывалася ў вершах

У конкурсе «Слёзы сясцёр Хатыні» паўдзельнічалі каля сотні берасцейскіх паэтаў. Кожны знайшоў россыпы слоў, каб выказацца на балючую тэму. Згадаем тых, хто стаў пераможцам.

Пружанскі паэт Мікола Антаноўскі сваю «Баладу пра вятрак» прысвяціў падзеям 17 ліпеня сорак другога, калі нацысцкія нелюдзі спалілі вёску Казлы. Падобны лёс напаткаў і некалькі блізкіх паселішчаў на Пружаншчыне:

*Няма Сычоўкі, Чорных Лоз, Устроні*
*І Дабраволі ўжо не адшукаць…*
*Але ёсць сонца, а пад сонцам — гоні,*
*Ёсць песня светлая, цяпло далоняў*
*І вечны сум людзей і ветрака.*

Наш зямляк Расціслаў Бензярук у вершы «Маналог Змітра Юрасіка» звярнуўся да драмлёўскай трагедыі, якая адбылася на Галавасек 1942 года. Паэт уклаў рыфмаваныя радкі ў вусны Дзмітрыя Юрасіка — аднаго з чатырох падлеткаў, каму пашчасціла жывым выйсці з агню ў час, калі палала «вогненная вёска» і ў ёй, нібыта свечкі, гарэлі жывыя людзі:

*За іх, загінулых, жыву,*
*Учынкі мераю сурова,*
*А попел беліць галаву*
*Ад полымя твайго, Драмлёва.*

Пяро ў руках Марыі Філіпавай пакінула на паперы твор, які паэтэса назвала «Сэрца помніць…». Яно, тое неспакойнае сэрца, сапраўды не можа забыць пра чужыя пакуты і з дапамогай лірычных радкоў распавядае пра гаротны лёс баранавіцкай вёскі Застарынне, знішчанай квітнеючым майскім ранкам 1943 года. І цяпер, праз дзесяцігоддзі, Марыя Мікалаеўна піша:

*Адгарэлі купальскія зоркі,*
*Сціхлі ліпеньскія навальніцы.*
*Я іду да магілы на ўзгорку*
*Пакланіцца.*

*Скрозь званочкі звіняць ціхім звонам,*
*І валошкі блакітам луг поўняць.*
*Тут была партызанская зона.*
*Сэрца помніць…*

Вёсцы з простай назвай Мошкі, што на Янаўшчыне, прысвяціла свой верш Ірына Саломка. Паселішча сустрэлася з бядою ў першы снежаньскі дзень 1942 года. Карнікі не ведалі літасці, таму сёння ўжо:

*Не сплятаць дзяўчыначкам*
*у вянкі валошкі,*
*Не збяруцца родзічы*
*ў свята за сталом:*
*З цішынёй заручана*
*вёска з назвай Мошкі,*
*Спіць і днём, і ночкаю*
*непрабудным сном.*

А Надзея Момлік з Дзівіна сваё лірычнае «Маўчанне надмагільных камянёў» прысвяціла Барысаўцы, спаленай 23 верасня 1942 года ў час «Трохкутніка» — той самай аперацыі, якая абарвала жыццё ў Драмлёве. Таму абедзвюм вёскам пасуюць радкі:

*Так многа тут затоена трывогі,*
*Дзе пазалотай сумны лес брыніць.*
*Давай, сыночак, збочымся з дарогі:*
*Там ля магілы пастамент стаіць.*

*На пастаменце маці, як багіня,*
*Ніколі не падыме галавы:*
*Там, у магіле, сотні іх, нявінных*
*Палоннікаў гаротных той вайны.*

Пра наша Драмлёва раней пісалі выключна паэты-землякі. Цяпер дзякуючы конкурсу лірычная скарбніца памяці пра жабінкаўскую сястру Хатыні папоўнілася вершам Надзеі Парчук з Брэста:

*Плыў верасень шчодры і шчыры*
*Над вёскай Драмлёва ў той дзень.*
*І сонца, сабраўшы ўсе сілы,*
*Лілося святлом на людзей.*

*Але нечакана тым ранкам*
*Варожы ўварваўся атрад —*
*І вогнішча страшнай маланкай*
*Шугнула над стрэхамі хат.*

…Ад смутку і болю да міру — такі няпросты шлях прайшлі нашы продкі. Мы ўдзячны ім за стойкасць, ахвярнасць і сілу духу, за тое, што яны гераічна выстаялі ў барацьбе. Разумеючы гэта, сваёй любоўю і клопатам мы старанна ахоўваем мір на зямлі.

Хочацца пажадаць усім міру, шчасця, душэўнай цеплыні, каб скарбонка берасцейскіх паэтаў і празаікаў штогод папаўнялася новымі цікавымі творамі. Няхай усё задуманае ажыццявіцца, а пісьменнікі разам з чытачамі, супрацоўнікамі бібліятэк і музеяў, навучальных і культурных устаноў працягваюць важную асветніцкую справу, радуюць новымі выданнямі, ідэямі і дасягненнямі.

**Анатоль БЕНЗЯРУК**
**Фота даслана аўтарам**

**Выпадкаў, калі дастаткова адзінага твора ці кнігі, каб аўтар увайшоў у гісторыю, нямала. У беларускай літаратуры яскравы прыклад таму — Максім Багдановіч з яго «Вянком». Калі ж хто-небудзь меў дачыненне да двух твораў, здавалася б, вядомасць павінна быць яшчэ большая. Ды як сказаць… Хто не чуў Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь, многім падабаецца «Песня пра Нёман», больш вядомая па першым радку «Ой, бацька мой, Нёман». Аднак гэта тычыцца часцей за ўсё аўтарства слоў. На жаль, далёка не кожны ведае, што музыку ў абодвух выпадках напісаў кампазітар, хормайстар, фалькларыст Несцер Сакалоўскі. Балазе, ёсць нагода ўспомніць яго добрым словам: у гэтыя восеньскія дні спаўняецца 120 гадоў дня нараджэння Несцера Фёдаравіча.**

# Увайш[illegible]торыю музыкай [illegible]ржаўнага гімна

МУЗЫКА ПЯТНІЦА

## «Бульба» лёс п[illegible]а

На свет ён з'явіўся 9 лістапада 1[illegible] года ў сям'і малазямельных сялян Фёдара Адамавіча і Зінаіды Іванаўны Сакалоўскіх вёскі Вешкі. Тады гэта быў Барысаўскі павет, цяпер Докшыцкі раён. Да песні, музыкі далучыўся ў маленстве. Маці, у дзявоцтве Судніковіч, у наваколлі славілася пявунняй. Родны брат бацькі Міхаіл Адамавіч быў цудоўным скрыпачом-самавукам. Жылі б Сакалоўскія ў Вешках, ды надарылася бяда: хата іх згарэла з усім няхітрым набыткам. Помачы не было ад каго чакаць, таму падаліся ў Мінск. Гаспадар уладкаваўся дворнікам, а Зінаіда Іванаўна — прачкай.

Сумаваў сын без песень. Бацькам з-за пастаяннага занятку было не да таго, каб клапаціцца аб яго будучыні. Таму толькі ў пятнаццацігадовым узросце пачаў вучыцца, паступіўшы ў Першую працоўную школу. Як жа ўзрадаваўся, што там вучылі і музычнай грамаце. Калі даведаўся, што ў школе ствараюцца гурткі мастацкай самадзейнасці, запісаўся ў адзін з іх. Не толькі спяваў, але і навучыўся іграць на балалайцы. Хутка стаў адным з самых актыўных школьных артыстаў.

Аднак невядома яшчэ, як бы склаўся яго далейшы лёс, калі б не пазнаёміўся з Кастусём Пуроўскім — з цягам часу Канстанцін Васільевіч стаў вядомым дзеячам беларускага тэатральнага і музычнага мастацтва. Розніца ва ўзросце ў восем гадоў не перашкодзіла ім пасябраваць. Хутка Несцер стаў сваім чалавекам і ў «Беларускай хатцы», дзе арганізоўвалі спектаклі і канцэрты члены Першага беларускага таварыства драмы і камедыі. Канстанцін Пуроўскі спяваў у хоры пад кіраўніцтвам Уладзіміра Тэраўскага. Заахвоціў да спеваў і яго. А яшчэ праз некаторы час удвух паспрыялі папаўненню рэпертуару цікавым творам.

Напаткалі неяк старую жанчыну, якая з вялікім задавальненнем спявала ўсім добра вядомую сёння «Бульбу». Слухалі як зачараваныя. А пасля, патлумачыўшы, чаму да яе такая ўвага, папрасілі сялянку праспяваць яшчэ раз. Потым зноў... Пакуль не запомнілі мелодыю, а словы, каб не забыць, занатавалі. Песня спадабалася і Уладзіміру Тэраўскаму. Яна адразу была ўключана ў рэпертуар хору.

Выпадак з «Бульбай» стаў для Несцера Сакалоўскага важным творчым урокам. Упэўніўся: народная памяць — невычэрпная скарбонка, што захоўвае нямала арыгінальных песень. Іх неабходна своечасова запісаць, каб не зніклі бясследна. Гэтым правілам кіраваўся і ў творчым жыцці. Занатаваў ажно звыш 500 беларускіх народных пеень і мелодый. Атрымліваецца, што «Бульба» ў многім яго кампазітарскі лёс і прадказала. Ды гэта пазней.

## А «Правда» адзначыла

Дыплом аб сярэдняй адукацыі атрымаў у 1921 годзе. Але чым канкрэтна заняцца, яшчэ не вызначыўся. Два гады выступаў з рознымі калектывамі, а ў 1923 годзе прызвалі ў Чырвоную Армію. Быў ротным запявалам, удзельнічаў у салдацкай мастацкай самадзейнасці, а хутка і ўзначаліў яе. Звольніўшыся праз тры гады ў запас, уладкаваўся ў Беларускі перасоўны драматычны тэатр Уладзіслава Галубка. Служачы акцёрам, неўзабаве стаў і хормайстрам. Паступіў на тэарэтыка-кампазіцыйнае аддзяленне тагачаснага Беларускага дзяржаўнага музычнага тэхнікума, цяперашні Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М. І. Глінкі.

На час заканчэння вучобы (1931) і прыпадае пачатак яго актыўнай кампазітарскай дзейнасці. Калі дакладна, сказаць немагчыма. Шмат якія матэрыялы згаданага перыяду згарэлі ў час бамбёжкі Мінска гітлераўцамі. На шчасце, захаваліся некаторыя выданні твораў Несцера Фёдаравіча. У 1931 годзе асобнай кніжачкай выйшла песня «Бальшавіцкая сяўба», у 1933-м — «Чырвонаармейская» і «Разгон не стрымаць». У 1934 годзе з'явіліся «8 песень для пачатковай школы». Падобныя творы адпавядалі таму, што хвалявала савецкае грамадства. Асобныя пісаліся як водгук аўтараў на пабачанае. Прынамсі, «Сяўба ў калгасе» з'явілася пасля наведвання Несцерам Сакалоўскім і пісьменнікам Алесем Якімовічам вядомай на той час сельскагаспадарчай арцелі «Перамога».

У некалькіх калгасах у ваколіцах Мінска Несцер Фёдаравіч стварыў аматарскія хары. Найбольшага поспеху дасягнуў калектыў з вёскі Рогава тагачаснага Заслаўскага раёна. Самадзейныя артысты ў ліпені 1936 года нават трапілі ў Маскву на Усесаюзную алімпіяду харавой творчасці. Разам з 29 прафесійнымі і самадзейнымі [illegible]алектывамі з усяго Савецкага Саюза. І толькі дзе[illegible]іх выступалі перад кіраўнікамі партыі і ўр[illegible]Праўда» асабліва вылучыла хор пад кір[illegible]а Сакалоўскага і адзін калектыў

*Несцер Сакалоўскі.*

## З душой, прагнай прыгожага

Новы этап у творчай дзейнасці Несцера Фёдаравіча пачаўся ў 1937 годзе пасля стварэння Дзяржаўнага ансамбля песні і танца Беларускай ССР. З'явіўся ўнікальны калектыў па прапагандзе найлепшых узораў вакальнага, інструментальнага і харэаграфічнага мастацтва беларускага народа. Кіраўнікамі ансамбля сталі вядомыя дзеячы, талент якіх раскрыўся ў гэтых галінах дзейнасці: Ісак Любан, Несцер Сакалоўскі і Канстанцін Алексютовіч. Несцера Фёдаравіча прызначылі хормайстрам.

Усе трое былі ўлюбёны ў нацыянальны фальклор, а прапаганду яго ўспрымалі адной з найважнейшых спраў свайго жыцця. З'явілася магчымасць не толькі належным чынам папулярызаваць яго, але і спрыяць, каб выдатныя самадзейныя выканаўцы ўліліся ў прафесійнае мастацтва. У выніку ў ансамбль былі залічаны такія пазней вядомыя беларускія артысты, як Т. Аўрамчык, П. Акулёнак, С. Лыскавец, Д. Чарапнін...

Несцер Сакалоўскі, захапляючыся беларускай народна-песеннай творчасцю, з павагай і разуменнем ставіўся і да фальклору іншых народаў, якія жылі на Беларусі. Яшчэ ў хоры Уладзіміра Тэраўскага спяваў не толькі беларускія, але і рускія, украінскія песні. Па-ранейшаму не губляў выпадку, каб запісаць цікавую мелодыю. Адбывалася ж гэта, як відаць з успамінаў Ісака Любана, у розных абставінах.

Ісак Ісакавіч прыгадваў такі выпадак. Неяк яны ўдвух кіраваліся з Бабруйска ў адзін з мясцовых калгасаў. Яўрэй-балагол нечакана заспяваў. Несцер Фёдаравіч, які сядзеў моўчкі, ажно наструніўся і пачаў падпяваць. Гэта атрымлівалася з цяжкасцю, бо слоў не ведаў. Ды і мелодыя была незнаёмая. Прасіў балагола ў некаторых выпадках паўтарыць яе. І старанна падхопліваў. Твар яго ў гэты момант свяціўся. Нібыта больш нічога ў свеце не існавала, апроч гэтай песні.

Любоў да фальклору прывяла да таго, што ў апрацоўках Несцера Сакалоўскага слухачы пазнаёміліся з многімі народнымі песнямі, цікавасць да асобных не аслабла і сёння. Па-ранейшаму атрымліваеш задавальненне, калі чуеш «А ў полі каліна», «Салавейка», «Лён» і іншыя. У свой час высока ацаніў майстэрства Дзяржаўнага ансамбля песні і танца Беларускай ССР і Уладзімір Захараў, які ўзначальваў славуты хор імя Пятніцкага.

Перад самай вайной Несцеру Фёдаравічу даручылі стварыць Палескі ансамбль песні і танца. Паклапаціўся не толькі аб належным падборы артыстаў, але і аб цікавым і разнастайным рэпертуары. Звярнуўся да паэтаў Петруся Броўкі, Артура Вольскага, Міхася Машары. Прыцягнуў да супрацоўніцтва і шэраг кампазітараў, у тым ліку Рыгора Пукста, з якім падтрымліваў цесныя кантакты.

## Новы час — новыя песні

Калі фашысты акупавалі Беларусь, апынуўся ў горадзе Алатыр, што ў Чувашыі. Некаторы час працаваў на заводзе, а пасля быў мабілізаваны і трапіў у гвардзейскую часць. Але служба працягвалася нядоўга. Многія дзеячы культуры, мастацтва, літаратуры хутка былі адазваны з часцей, каб займацца творчай працай.

У 1943 годзе Несцер Фёдаравіч стаў мастацкім кіраўніком Беларускага дзяржаўнага ансамбля песні і танца, які тады знаходзіўся ў Заволжжы. Калі пачалося вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, яго выклікалі ў Нова-Беліцу, дзе размяшчалася кіраўніцтва Беларусі, і прызначылі начальнікам аддзела мастацкай самадзейнасці Упраўлення па справах мастацтва Беларускага ўрада.

У суровы і складаны час напісаў нямала твораў, якія заклікалі да барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, уздымалі дух савецкага народа. Але разумеў, што прыйдзе час, калі зноў будуць запатрабаваны песні высокай духоўнай напоўненасці, прасякнутыя тонкім лірызмам, а ў неабходных выпадках — пафасам, што выяўляе сам дух народны. Так былі напісаны «Песня пра Нёман», «Сюіта на тэмы беларускіх народных песень», куды арганічна ўпляліся матывы такіх выдатных твораў, як «Ой, каліна, маліна», «Зайшоў, зайшоў бел малойчык», «Ой сын едзе», «А каб я тое знала» і «Хмарыцца — дождж будзе». І, канешне ж, «Мы — беларусы» — плён творчага супрацоўніцтва Несцера Фёдаравіча з паэтам і драматургам Міхасём Клімковічам.

## «Мы — беларусы» заспявалі адразу

Напісалася песня «Мы — беларусы» на схіле вайны, у 1944 годзе. І адразу звярнула на сябе ўвагу дзякуючы таму, што змест яе быў блізкі памкненням беларускага народа. Яна выяўляла тое, што было ў сэрцах людзей, жыло ў іх душах, сведчыла аб братняй дружбе беларусаў і рускіх — двух славянскіх народаў.

Калі «Песня пра Нёман» стала народнай толькі цягам часу, дык «Мы — беларусы» адразу. Яе заспявалі паўсюдна, бо была ўключана ў рэпертуар многіх калектываў. Хутка стала вядома і далёка за межамі Беларусі. Цікавае наконт гэтага сведчанне кіраўніка Азярышчанскага народнага хору Таццяны Лапацінай, якая некалі пісала: «Наш хор атрымлівае дзясяткі пісем з усіх канцоў Савецкага саюза з просьбай даслаць нашы песні... Я накіравала "Мы — беларусы"».

Таму невыпадкова, што, калі паўстала пытанне аб Дзяржаўным гімне БССР, выбар спынілі менавіта на песні Несцера Сакалоўскага і Міхася Клімковіча. 24 верасня 1955 года яна ўпершыню прагучала ў сваёй новай ролі. На жаль, Несцер Фёдаравіч парадавацца гэтаму не змог: яго не стала 16 лістапада 1950-га.

Заўчасна пайшоў з жыцця, бо не мог пахваліцца моцным здароўем, а пасля вайны яно пачало пагаршацца. Таму вымушаны быў пакінуць вучобу ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, але з працай у Дзяржаўным выдавецтве БССР, дзе ўзначальваў рэдакцыю музычнай літаратуры, не развітаўся. Дзякуючы яму пабачылі свет многія зборнікі твораў беларускіх кампазітараў, рыхтаваліся спеўнікі, адрасаваныя аматарам музыкі, выдаваліся вядомыя арыі, апрацоўкі народных песень.

Як вядома, 3 студзеня 2002 года быў абвешчаны конкурс на новы Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь. Пасля падвядзення вынікаў вырашылі музыку пакінуць ранейшай. А лепшым прызналі тэкст, прадстаўлены паэтам Уладзімірам Карызнам, які перапрацаваў верш, напісаны раней Міхасём Клімковічам.

* * *

На магіле Несцера Сакалоўскага — помнік-сімвал. На высокім пастаменце знаходзіцца скульптура мужчыны з густою барадой і не менш густымі валасамі, якія ўскудлаціў вецер. Увасабляе яна бацьку Нёмана, так цудоўна апетага Несцерам Фёдаравічам, а Нёман жа — гэта таксама сімвал Беларусі, адным з самых выдатных сыноў якой і быў Несцер Фёдаравіч Сакалоўскі.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

## Уладзімір УРОДНІЧ:

# «Прытрымліваюся лозунга “Трэба спяшацца!”»

МАСТАЦТВА ПАНЯДЗЕЛАК

**Заслужаны дзеяч мас… лаўрэат спецыяльн… Прэзідэнта дзеячам ку… стацтва ў намінацыі «… мастацтва», старшыня су… дыцыя» Беларускага саюза Уладзімір Уродніч — чалавек… і прынцыповы. Што стаіць за… якасцямі? Гутарка з жывапісцам… …ра самае асабістае — карані.**

Фота Кастуся Дробава.

**— Уладзімір Васільевіч, што хацелі сказаць нядаўняй персанальнай выстаўкай у Палацы мастацтва?**

— Яна задумвалася як прысвячэнне майму дзяцінству і юнацтву. Імкнуўся расказаць пра свой шлях — як дабіраўся і прабіраўся праз балоты ў гэты вялікі Мінск. Шкада, што на выстаўцы, як мне падаецца, не зусім адбылася мая размова як мастака з вясковымі людзьмі. Работ, змешчаных у экспазіцыі, атрымалася недастаткова. А хацелася, каб гледачы зразумелі, што мая прыхільнасць да вёскі была і застаецца. Я не стаў гарадскім чалавекам — кожны дзень перад сном у думках праходжуся па сваім хутарскім дворыку. Аднойчы на свяце роднай вёскі Вялікія Арлы сказаў: «Мая душа тут, сярод вас, яна ніколі не адвязвалася ад гэтай зямлі, але цела павезлі туды, далёка…» Калі еду на машыне дадому і бачу мост цераз Прыпяць, чую галасы родных.

**— Гэтыя галасы працягваюць гучаць і ў вашай творчасці…**

— Гэта асобная тэма. У гадоў 7-8 часта слухаў, як жанчыны, праполваючы лён, спявалі песні. З асаблівым хваляваннем успамінаю велікодныя дні. Дажджы, размытыя шляхі, наўкола гразь, але абапал дарогі каля платоў — лавачкі, на якіх сядзяць прыгожа ўбраныя жанчыны і назаіраюць за моладдзю: хто падрос, хто рыхтуецца жаніцца і з кім… Раптам ідзе адна шарэнга дзяўчат — так хораша спяваюць, аж дух займае, слёзы на вочы наварочваюцца. Праз некаторы час — другая шарэнга! А вёска пасля вайны была даволі ўладкаваная, гэта ўжо зараз не тое…

**— Якія старонкі жыцця — вашага і той вёскі — згадваеце найчасцей?**

— Вядомы факт: мой бацька ваяваў у партызанскім атрадзе імя Чкалава брыгады «Савецкая Беларусь» і загінуў у 1943-м — у 19 гадоў. А ў 1946-м згарэла наша хата, як кажуць, пры нявысветленых абставінах. Пазней я прыйшоў да высновы, што гэта была помста паўстанцаў, бо бацька быў партызанам, тым больш намеснікам камандзіра. Маці потым казала: «Падумаеш, па гаспадарчай частцы!» Пажар адбыўся, калі мне было ўсяго 4 гады, але ў маім уяўленні гэта нібыта ўчора: агульная трывога, боязь за мяне малога, ратаванне нейкіх рэчаў…

**— Вайну, зразумела, вы памятаць не можаце, але ж шмат павінны былі расказваць старэйшыя.**

— Натуральна. Быў такі выпадак. У 1943 годзе пайшлі чуткі, што карнікі збіраюцца спаліць вёску. Пайшлі хавацца ў лёс. Мяне, немаўля, так накусалі камары, што пачаў крычаць — не ўтаймаваць. Мяне — у падушкі, а ў іх задыхаюся… Так, мог загубіць многа людзей. Аднак пашанцавала. Той дуб, пад якім хаваліся ў лесе, і зараз стаіць. Па матывах гісторыі стварыў палатно «Маё раскрыжаванне».

**— Водгулле тых падзей — моцны матыў вашай творчасці. А па жыцці яго часта адчувалі?**

— Так. Падчас вайны мая прабабка сустрэла на станцыі «Лахва» жанчыну — Вольгу Ярмак, якой прапанавала даглядаць мяне, калі маці і іншыя родзічы будуць у полі. Цэлы год жанчына была маёй гувернанткай. Пасля з'ехала ў Мазыр на будоўлю. Сустрэліся мы з ёй толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў: калі мне была прысуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта, газеты пачалі пісаць пра лаўрэатаў. У адным з інтэрв'ю я расказаў пра свае карані. Так Вольга Аляксееўна пазнала і адшукала таго Уладзю. Усё жыццё яна была ўдзячна за тое, што наша сям'я фактычна выратавала яе ў тыя страшныя часы. Цяпер жанчыны няма на гэтым свеце, але з яе сям'ёй мы сябруем дагэтуль. Працягваецца сувязь, народжаная вайной. Дарэчы, куды б я ні ішоў вучыцца, звярталі ўвагу, што сын загінулага партызана.

**— Якімі былі інтарэсы вашага дзяцінства? Калі захапіла выяўленчае мастацтва?**

— Любіў рабіць самалёцікі з лазы. Пазней вельмі цікавіўся кінаперасоўкамі, якія вазілі ў той час, калі ў вёсцы не было электрычнасці. Вялікае ўражанне зрабіў фільм «Сын палка», таму марыў паступіць у Суворaўскае вучылішча. Толькі недзе ў 6 класе з'явіліся думкі пра мастацтва. Аднойчы мой сябар Славік Амяльчук на звычайным лісце са сшытка намаляваў Леніна. Я здзівіўся — які падобны! І мяне неяк гэта захапіла. Пасля таго, як і ў мяне Ленін атрымаўся, пачаў перамалёўваць усё, што бачыў. А яшчэ падштурхнула тое, што дзед, малоцячы ў клуні жыта, мог адарвацца, узяць крэйду і намаляваць на вушаку каня, які бяжыць. Пазней даведаўся: не толькі дзед быў здольны да гэтага — бацька таксама хораша маляваў. Калі пачалася вайна, ён на адным вушаку выявіў партызана, а на другім — немца.

**— Якім чынам вызначыліся з прафесіяй?**

— Напэўна, у 1956 годзе ў вёску Лядзец адправілі групу па ўсталяванні электрычных слупоў. У яе ўвайшоў Гена Кукскюк, у якога меліся алейныя фарбы (пра існаванне такіх я тады не ведаў). Заўважыўшы маю цікавасць да таго, як ён малюе, сказаў: «Нясі літр самагону, я табе фарбы дам». За мной справа не стала. Так, перамалёўваць навучыўся, а прыдумаць сюжэт сам яшчэ не мог. Між тым сям'я бачыла маё захапленне і радавалася наяўнасці такіх здольнасцей. Дарога ў жыццё была вызначана.

**— У часы вашай вучобы ў Мінскім мастацкім вучылішчы, студэнцтва ў тэатральна-мастацкім інсытуце ў Савецкім Саюзе стварала плеяда выдатных мастакоў. На каго з іх раўняліся?**

— Напрыклад, на выдатнага жывапісца Аляксандра Асмёркіна, у якога вучыўся Натан Воранаў, мой настаўнік. Нельга не ўспомніць Яўсея Майсеенку, які таксама быў «асмёркінцам». Гэта мой кумір. Аднойчы я яму асабіста сказаў пра гэта, звярнуўшы ўвагу на тое, што ў музеях Савецкай Беларусі няма ніводнай яго работы, ніводнай выстаўкі. А ён адказаў: «Што я магу зрабіць, калі радзіма мною так цікавіцца…» 40 гадоў я дамагаюся, каб у Беларусі адбылася хоць невялічкая выстаўка яго твораў. За апошні час мы аддалі даніну павагі УНОВІСу, Казіміру Малевічу, Васілю Кандзінскаму, Марку Шагалу, а многія знакавыя мастакі, да творчасці якіх неабходна наблізіцца, застаюцца ўбаку.

**— Хто яшчэ вам блізкі па духу? Здаецца, вы ніколі не адыходзілі ад выбранага шляху…**

— Мае настаўнікі ў тэатральна-мастацкім інстытуце: Іван Ахрэмчык, Акім Шаўчэнка, Натан Воранаў. Апошняга лічу богам у жывапісе. Дарэчы, пад яго кіраўніцтвам я і рабіў дыплом, Натан Майсеевіч мяне амаль не кантраляваў. Савецкая мастацкая школа будавалася на аснове імператарскай акадэмічнай. Мы працягвалі яе найлепшыя традыцыі. Ці трэба даказваць, што савецкае мастацтва, якое нарадзіла суровы стыль, што стаў вельмі яркай старонкай сусветнай культуры, — гэта нешта значнае? Для разумных людзей у гэтым патрэбы не існуе.

**— Што вас цікавіла ў часы студэнцтва? У чым была асаблівасць навучання ў тыя часы?**

— Савецкая школа выяўленчага мастацтва патрабавала, каб выпускнік зрабіў кампазіцыю на сацыяльна значную тэму. Гэта было прызначэнне ВНУ. З першага да апошняга курса я займаўся выключна армейскай кампазіцыяй. Усе мае тры армейскія гады выкладваў на курсавыя работы.

На першым курсе задалі тэму: «Грамадзянская вайна». Мы, студэнты, натуральна, ведалі яе толькі па ўспамінах, рэакцыях на пэўныя здарэнні. Аднак такім быў вучэбны працэс. Раблю эскіз: над ракой плыве туман, чырвонаармейскі атрад раніцою поіць коней. Іван Ахрэмчык выклікае студэнтаў і просіць мяне прынесці сваю работу. Думаю: «Дасць дык дасць!» А ён на гэтым прыкладзе вырашыў паказаць, як трэба працаваць. Момант вельмі запамінальны.

**— Іван Ахрэмчык быў патрабавальным выкладчыкам?**

— Працаваў я над сюжэтам: скончылася вайна, салдаты вяртаюцца дадому, сады цвітуць… За гэтую курсавую паставілі «5», але Іван Восіпавіч падкрэсліў: на дыплом гэта не цягне, трэба брацца глыбей. Так, неабходна было кожны чацвер прыносіць не меней чым тры эскізы. Я вытрымаў тры тыдні. Пазней Ахрэмчык сказаў, што хацеў бы ўбачыць сюжэт, варты радкоў Аляксея Фацянава: «Соловьи, соловьи, не тревожьте солдат, // Пусть солдаты немного поспят…» Як гэта перакласці на мову жывапісу? Прапанаваў выявіць салдата ў плашч-палатцы пры амуніцыі на фоне куста бэзу, які вельмі любіў… Пазней сам сабе думаў: «Ці не прапаноўваў ён паспрачацца з Урубелем?» (*смяецца. — **Заўв. аўт.***). Наогул, я сябе значным каларыстам не лічыў, у мяне больш спрытна ішла кампазіцыя. Натан Воранаў падкрэсліваў, што мастак павінен адчуваць тое, што ў яго лепей атрымліваецца. Нашмат пазней, калі асэнсаваў некаторыя каларыстычныя праблемы, якія маю, зразумеў, што ўсе да гэтага ўмення даходзяць парознаму. Ведаю, што ў маёй творчасці не хапае цёплых колераў, увесь халодны, але што зрабіць… Школа Натана Воранава.

**— Як жа скончылася сітуацыя з дыпломам?**

— Так ці інакш, Іван Ахрэмчык замучыў мяне сваімі патрабаваннямі, я ўжо не ведаў, як выйсці з сітуацыі. І тут раптам паведамляюць: прафесара не стала. Пайшлі групай да рэктара — прасіць, каб нас накіравалі да Воранава. Так, болей бандыкаватых, як, напрыклад, Аляксей Марачкін, Уладзімір Тоўсцік і Уладзімір Уродніч, адправілі да яго, астатніх — да Пятра Крохалева. Натан Майсеевіч заўважыў, што ў мяне вельмі добра атрымліваліся зімовыя пейзажы. Неабходны кантраст. Так і атрымаўся дыплом «Дарогамі Перамогі». 3,4 на 1,9 м — памер невыпадковы. Фігура на пярэднім плане павінна быць не занадта вялікай і не маленькай для таго, каб прапісаць псіхалогію героя. Пазней карціну шмат дзе выстаўлялі, разрэзалі падрамнік, раму знялі… Вісела яна нават у адной з паліклінік да Дня Перамогі. Доўгі час была згорнута ў трубачку, і калі ўзнікла неабходнасць яе надрукаваць, высветлілася, што многія фрагменты асыпаліся. Верагодна, карціну можна было б рэстаўраваць, але, здаецца, калі гляну на яе, удар хопіць. Я ўклаў у яе вельмі шмат душы.

**— На працягу жыцця вы займалі розныя пасады ў Міністэрстве культуры, Акадэміі мастацтваў, Саюзе мастакоў. Як паспявалі займацца жывапісам?**

— Прытрымліваўся наказу Натана Воранава: заключаць дагавор на выкананне карцін і атрымліваць аванс, бо тады адчуваецца адказнасць. Кожны год, пакуль працаваў у апараце Мінкульта, ствараў 1—2 вялікія палотны. Ніколі не ўяўляў сябе без творчасці. Ды і сёння колькі задум!.. Прытрымліваюся лозунга «Трэба спяшацца!». Шкада толькі — мала займаўся дзецьмі.

**— Вы не вельмі станоўча выказваецеся пра сучаснае мастацтва. Чаму?**

— Галоўнае ў творы — змест, ход мыслення і дэталь, за якую можна зачапіцца. Такое сёння складана знайсці. Адно з наймацнейшых уражанняў у жыцці — знаёмства ў Луўры з карцінай «Плыт Медузы» Тэадора Жэрыко. (Яе ў свой час хваліў Іван Ахрэмчык.) Такі ўзровень мастацтва здольны ўзвысіць чалавечую годнасць. Калі яно гэтаму не спрыяе, то навошта такое мастацтва? Сёння мы прыйшлі, здаецца, да абсалютнага прымітыву, адышлі ад прастаты і праўды, без якіх, як казаў Леў Мікалаевіч, няма велічы.

**— Што магло б паспрыяць мастацкаму працэсу ў Беларусі?**

— У свой час Міністэрства культуры атрымлівала лісты з просьбай даць звесткі аб вядучых мастаках, якія працуюць над доўгатэрміновымі заказамі значнай дзяржаўнай тэматыкі. Вось гэта пастаноўка пытання! Чаму дзяржава зараз не робіць такія заказы і не ставіць канкрэтныя задачы? Чаму не выдаткоўвае сродкі? Шмат гадоў выступаю за вяртанне сістэмы дзяржзаказу. Мастакі пасля вучобы здольны нешта даць, дык неабходна арганізаваць для іх пэўны плацдарм! Сёння ладзіцца шмат пленэраў, але навошта гэтая трата грошай? Як за тыдзень можна стварыць знакавы сюжэт? З якой кампазіцыйнай пошукавай схемай едуць творцы на пленэр? Ці атрымаецца ў выніку пераканаўчы твор? Заўважаю: практычна знікла з выставак сюжэтна-тэматычная карціна. Неабходны штогадовы конкурс, каб мастакі змаглі годна расказаць пра тыя ці іншыя важныя даты нашай гісторыі. Мастацтва і культура — інструменты дзяржаўнай ідэалогіі. Чаму не карыстаемся імі? Неабходна ісці насустрач плыні, якая сёння існуе.

**Гутарыла Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Купалаўская рапсодыя «Харошак»

**Лёсавызначальныя для нацыі асобы даюць моц і натхненне не аднаму пакаленню. 140-годдзе Янкі Купалы ахінае Беларусь святочным покрывам, ствараючы новыя нагоды для ўшанавання таленту, самабытнасці. Увасабленнем самабытнасці з'яўляецца і Беларускі дзяржаўны харэаграфічны ансамбль «Харошкі». І нездарма, пэўна, іх праграма «Фальклор. Залатая калекцыя» была прадстаўлена ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Як сведчанне, што ансамбль гучыць на адной хвалі з народным паэтам — на хвалі духоўнай сілы і жыццялюбства...**

*Музычна-харэаграфічная кампазіцыя «Перапёлачка».*

Беларускі дзяржаўны харэаграфічны ансамбль «Харошкі» — наш нацыянальны брэнд, калектыў, які ў сваім падмурку мае найбагацейшы фальклорны матэрыял, што стварае непаўторны нацыянальны каларыт. Канцэрт у Купалаўскім «Фальклор. Залатая калекцыя» стаў стартам цыкла сольных канцэртаў «"Харошкі". Жывая легенда беларусаў». Нярэдка наша душа патрабуе танца, а лепш танца са спевамі і найгрышамі, ды каб яшчэ ўсё ўжывую. Ці не таму на «Харошак» у Купалаўскім сабралася паўнюткая зала?! Каб зазнаць вір пачуццяў, які дорыць адмысловая тэатралізаваная дзея ансамбля ў атмасферы Купалаўскага. І ўсё сышлося: моц тэатра Янкі Купалы і харызма і шчырасць «Харошак».

Адна з візітовак ансамбля — надзвычай прэзентабельная і сэнсава насычаная харэаграфічная замалёўка «Камарынская» — у Купалаўскім паўстала ў новай эмацыянальнай афарбоўцы, і на тое ёсць падставы.

— Гэтая сцэна — з вялікай гісторыяй, працаваць тут прэстыжна, але яна вымагае і вялікай адказнасці перад гледачом, перад любімай публікай, — адзначыў саліст заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Андрэй Макарук. — Канечне, аддаеш сябе без астатку, каб, у тым ліку, атрымаць узамен. Калі атрымліваеш аддачу, хочацца працаваць больш. «Камарынская» мне блізкая па духу, тут паказана ўся наша самабытнасць: як продкі працавалі, жылі, а галоўнае — весяліліся.

*Спявае Вольга Неўмяржыцкая.*

Адзін з адметных момантаў сола Андрэя — калі ён трэ па мыйнай дошцы. «Першы час было неяк незразумела: трэш і трэш па ёй... — заўважае артыст. — А потым з часам, як кажуць, "прыціраешся" і пачынаеш шукаць штосьці новае, а ўвогуле весялюся — не проста раблю рухі, а імправізую».

І гэта заўважна. «Камарынская» паказвалася безліч разоў, але кожны раз выглядае непаўторна, як і сёння. Уся справа ў імправізацыі?.. Вядома! Ды і атмасфера Купалаўскага, і жывое выкананне, дзе прысутнічае душа, якая атрымлівае задавальненне ад любімай справы. Інакш як маглі б выдаваць артысты такія акрабатычныя трукі! «Брава, хлопцы!» — крычалі ў зале. Але разам з весялосцю ёсць у гэтай кампазіцыі вельмі кранальны, душэўны, нават інтымны момант: калі сыны хрэсцяцца на птушыны шчэбет, для таго каб пайсці касіць. Зразумела, у гэтым жэсце адданасць Радзіме, Богу і вялікая прага жыцця. Глыбокая задумка Валянціны Гаявой!

«Харошкі» ў Купалаўскім падарылі россып прыгожых музычных пацерак. У «Гармонікавых найгрышах» салісты Уладзімір Гінько і Аляксандра Ісаенка быццам спаборнічаюць: гармонік са скрыпкай. Вельмі эмацыянальна насычаная столінская пастараль «Пастушок»: віртуозныя скокі ў парах транслююць гарачыя пачуцці — быццам расповед гісторыі кахання. А найбольш эфектна — калі хлопцы нясуць дзяўчат на руках, як вазы з букетамі.

Асаблівай маляўнічасцю ўразіў танец вёскі Харошкі «Гусарыкі»: дзяўчаты-птушкі па лінейцы — быццам на крылах-плячах у хлопца. І сваімі рукамі-крыламі расказваюць тайну душы... Словы песні ад вакалістак садзейнічаюць гэтаму: «Люблю тога кавалера, што іграе ў дуду. Я з ім трохі пагуляю і замуж пайду...», «Ой, пшаніца яравая, ой, пшаніца мяккая, за гусарыка пайду — буду я багатая!» Дзяўчаты балансуюць на адной назе — і гэта на біс!

Што можа быць ярчэй, чым полька, асабліва з найгрышамі на гармоніку? «Віцебская полька» — таму доказ. Усмешкі салістак, запал, агонь так і вабяць! Гопаюць польку — і душа ў скокі! Асабліва калі падключаецца аркестр з барабанамі — шквал энергіі!

Кранула струны душы салістка Марына Анкуда з жартоўнай песняй «Арэшанька»: «Як у полі пад арэшанькай сядзяць дзеўкі з качарэшанькай... Сталі дзевак камары есці...»

Музычна-харэаграфічная кампазіцыя «Беларускія мадонны» сусветнага маштабу: жанчыны ідуць, пагойдваючыся, несучы вялікі сімвал — ручнік. Высокае званне мадоннаў — правобраз багінь — падкрэсліваюць вытанчаныя галаўныя ўборы з саломы. Зоркі на іх зіхацяць надзеяй і веліччу.

Вакальна-інструментальная кампазіцыя «Што ж ты не прыйшоў...» — гармонія чацвярых салістаў, што найлепшым чынам прэзентуе іх харызму: «Аддай ты мяне, мая мацінка, за каго я хочу...»

А ці ўяўляеце, што ў адным з танцаў галоўны — бубен? Так, так, яго падкідаюць, і адбываецца дзея: «Вёскі дзве пайдуць па кругу — музыканты, весялуху!»

Аксамітнае сола цымбалаў з пералівамі, ад якіх хочацца ўзлятаць, спяваць, марыць, прадвяшчае новы эмацыянальны ўсплёск — «Ходзіць пава». І асабліва радуецца вока: непераўзыдзеныя галаўныя ўборы, яркія спадніцы з аранжавымі ўстаўкамі, здзіўляльная пластыка... Ну, а калі бачыш фіялетавага саліста-«паўліна» з дэлегацыяй дзяўчат у рознакаляровых пярэстых уборах — лепшай экзотыкі не ўявіць!

— Наконт касцюма да нумара «Пава» вось што хачу сказаць, — дзеліцца мастак па касцюмах Аляксей Гаявы. — Ёсць такі беларускі анекдот. Селянін гаворыць: «Пан, ты на льва падобны». — «Ну і дзе ты, дурань, льва бачыў?» — «Вунь Марыя на асле едзе». — «Ну дык на асле ж!» — «Вось на яго і падобны!» Таму певень — гэта асацыяцыя: як сабе мог уявіць паўліна чалавек, які яго ніколі не бачыў.

Аляксей Гаявы выяўляе сваё адметнае бачанне мастацтва з дапамогай адмысловых вобразаў, увасобленых у касцюмах. «Спачатку ёсць танец, музыка — застаецца толькі не сапсаваць. Калі кампазіцыя натхняе, то хочацца і дарабіць штосьці, стварыць адпаведны вобраз», — лічыць ён. І гэта ацэньваюць гледачы.

— Адчуванні ад сённяшняга канцэрта неверагодныя! — адзначае салістка заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Алена Якубец, якая адразу ўражвае сваёй прамяністасцю і шчырасцю, лье дабрыню як сонейка. — Адкрыццё сезона прагучала ярка! Радуе, што гледачы праяўляюць цікавасць да нашай творчасці — поўная зала. Любоў адчувалася з першага нумара. Апладысменты, бляск у вачах, усмешкі — дзівосны абмен энергіямі! Мы атрымалі вялікае задавальненне, і гледачы, спадзяюся, таксама.

Музычна-харэаграфічная кампазіцыя «Перапёлачка» — як выяўленне чулай і пяшчотнай, тонкай і неабсяжнай душы Валянціны Гаявой, яе крэатыву і любові да справы. Тры анёлы ў белым — Ірына Грушова, Алена Макарук і Васіль Прыходзька, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, — рухаюцца ў плаўным, меладычным танцы.

*Музычна-харэаграфічная кампазіцыя «Беларускія мадонны».*

Сола чарнявай прыгажуні салісткі Вольгі Неўмяржыцкай быццам дадало моцы душэўнай лірыцы ў кампазіцыі «Дума»: «Не судзі, мама, строга ты мяне...»

Даў дыху, дэманструючы вынаходлівасць на трашчотках, непаўторны Фёдар Балабайка, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь. Яму на цымбалах віртуозна акампаніравалі Ульяна Гаўрылава і Зінаіда Савацеева.

Было адчуванне, што танцуеш і спяваеш разам з артыстамі — такі эфект стварыла зала Купалаўскага, дамашняя, утульная і быццам родная. І фінальныя «Скокі» так і цягнулі забегчы на сцэну і далучыцца да танцораў. Бо якія выкрутасы яны рабілі! Круцілі дзяўчыну-салістку як ваўчок, лёталі дугой над сцэнай — адным словам шакіравалі і адначасова зараджалі танцавальным імпэтам!

*Інструментальная кампазіцыя «Барыня». Саліруе Фёдар Балабайка.*

«Харошкі», пераканалася, — гэта заўсёды настрой, свята і радасць, бо ўвесь час душа наросхрыст! Ды як іначай, калі яны жадаюць, запрашаючы на новую сустрэчу: «Будзьце здаровы, жывіце багата, хлебам і сонцам хай поўняцца хаты!»

**Наталля СВЯТЛОВА, фота аўтара**

**На сцэне Вялікага тэатра Беларусі адзначылі юбілей народнага артыста СССР, мастацкага кіраўніка тэатра Валянціна Мікалаевіча Елізар'ева. Яго імя цесна звязана з гісторыяй беларускага балета. За гады плённай працы ў тэатры ім былі пастаўлены спектаклі найвышэйшага ўзроўню. Пастаноўкі майстра вартыя не толькі прыхільнасці мінскай публікі, але і сусветнага прызнання.**

*Валянцін Елізар'еў на сцэне Вялікага тэатра.*

ТЭАТР АЎТОРАК

# Гонар [illegible] беларускага балета

## Свята на сцэне

4 лістапада вялікая ўрачыстасць на сцэне роднага тэатра Валянціна Елізар'ева распачалася са сцэны «О фартуна!» з балета «Карміна Бурана».

Артысты балетнай трупы і салісты хору Вялікага тэатра на чале з народнымі артыстамі Беларусі Ірынай Яромкінай і Ігарам Артамонавым нагадалі ўдзельнікам вечара аб слаўнай старонцы беларускага балета, што стала класікай.

У святочны вечар прагучала віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, якое зачытаў міністр культуры Анатоль Маркевіч:

«Дзякуючы Вашай натхнёнай працы склалася сучасная беларуская балетная школа, яе дасягненні сталі знакавымі старонкамі летапісу Вялікага тэатра Беларусі.

За гады адданага служэння мастацтву Вы дабіліся бліскучых творчых поспехаў. Вашы спектаклі з'яўляюцца сапраўднай легендай сцэны, а кожная пастаноўка перадае магію пластыкі чалавечага цела, закранае тонкія грані душы».

Кіраўнік дзяржавы пажадаў Валянціну Елізар'еву моцнага здароўя, натхнення і невычэрпнай энергіі.

— Я маю гонар асабіста павіншаваць Валянціна Мікалевіча з 75-годдзем. Увесь ваш творчы шлях звязаны з тэатрам оперы і балета Рэспублікі Беларусь, якому вы адданы з 1973 года. Дзякуючы вашаму самаадданаму служэнню тэатру, мы можам быць упэўнены ў тым, што беларускі балет рухаецца ў правільным кірунку, — дадаў міністр культуры.

## Народжаны ў Баку — адданы Мінску

Будучы легендарны балетмайстар беларускай сцэны нарадзіўся 30 кастрычніка 1947 года ў сям'і ваеннага Мікалая Елізар'ева, які па службе ў той час знаходзіўся ў Баку. Сталіца Азербайджана пакінула ў сэрцы Валянціна Елізар'ева вялікі след і засталася цёплым успамінам, які ён пранёс праз усё жыццё.

Аб сваім захапленні танцамі харэограф выказваецца сціпла: «У той час у двары ў хлопчыкаў і дзяўчат абавязкова павінна была быць нейкая актыўнасць. Пэўны гурток па-за школай. Вялікая група хадзіла ў харэаграфічны гурток у Дом афіцэраў. Так я абраў танцы».

Выкладчыкам у гуртку быў Леў Ваганавіч Ляонаў, які акрамя таго загадваў балетнай трупай Азербайджанскага тэатра оперы і балета. Менавіта па рэкамендацыі настаўніка Валянцін Елізар'еў перавёўся ў 1964 годзе ў Ленінградскае харэаграфічнае вучылішча, клас Генадзя Сялюцкага. Скончыў вучылішча (цяпер Акадэмія рускага балета імя А. Я. Ваганавай) у 1967 годзе, аднак працаваць у тэатр не пайшоў. Працягнуў вучобу. Паступіў на балетмайстарскае аддзяленне Ленінградскай дзяржаўнай кансерваторыі імя М. А. Рымскага-Корсакава, курс народнага артыста РСФСР Ігара Бельскага.

Адзін з асноўных прынцыпаў работы Бельскага — «ставіць дзе заўгодна і як мага больш». Кіруючыся запаветам майстра і настаўніка, малады харэограф у 1967—1968 гадах працаваў кіраўніком харэаграфічнага гуртка ДК імя 1-й Пяцігодкі ў Ленінградзе, а ў 1968—1970 загадваў студыяй танца Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Падчас вучобы адбылося яго знаёмства з будучай жонкай і паплечніцай Маргарытай Ізворска-Елізар'евай. Як адзначала ў сваёй кнізе «Феномен Валянціна Елізар'ева» журналістка Інеса Плескачэўская: «Майстар знайшоў сва[illegible] Маргарыту».

У 1973 годзе Валянцін Елізар[illegible] чыў навучанне. У плана[illegible] у Балгарыю, аднак М[illegible] туры СССР не [illegible] харэографу з[illegible] довы вы[illegible] майс[illegible] вялік[illegible] эатра оперы і балета Беларускай ССР.

Мінск быў трэцім горадам, які заваладаў сэрцам майстра. Пасля сонечнага і духмянага Баку, пахмурнага і велічнага Ленінграда Мінск стаў яму родным. У асобных інтэрв'ю Валянцін Мікалаевіч падкрэслівае, што і адчувае сябе ўжо беларусам.

За гады працы ў Вялікім тэатры Беларусі маэстра паставіў балеты сусветнага ўзроўню. Пра мінскую трупу загаварылі, беларускі балет займеў уласны непаўторны твар.

У 1979 годзе ён стаў народным артыстам Беларусі, а ў 1985-м — народным артыстам СССР. З 1995 года — прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. У 2000—2008 — член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

## «Няма нічога больш выразнага, чым чалавечае цела»

Кожны балет Валянціна Елізар'ева — вяха ў творчасці, абсалютнае адлюстраванне поглядаў маэстра на жыццё і свет.

«Кармэн-сюіта» Ж. Бізэ — Р. Шчадрына стала першым балетам, які Валянцін Елізар'еў паставіў на сцэне Вялікага тэатра Беларусі. Ужо ў самай першай вялікай пастаноўцы балетмайстар заклаў тыя рысы свайго стылю, якія мастацтвазнаўцы вывучаюць і сёння.

Пазбаўленне ад лішняга, у тым ліку герояў, колераў, рухаў, пераўтварэнне балета ў прытчу, лаканічны аповед аб вечным, — цалкам новы погляд на добра вядомую гісторыю.

Прадстаўлены ў 1974 годзе балет «Кармэн-сюіта» стаў адкрыццём для мінскай публікі, якая і чакала такога харэографа — маладога, энергічнага, са своеасаблівым разуменнем тэатральнага мастацтва. Прыняла Елізар'ева і балетная трупа.

Менавіта праца над першым балетам для Беларусі звяла лёсы двух творцаў — Валянціна Елізар'ева і Яўгена Лысіка. Апошні быў сцэнографам Львоўскага тэатра оперы і балета і прыехаў у Беларусь па запрашэнні галоўнага дырыжора Яраслава Вашчака, які працаваў дагэтуль у Львове.

Старэйшы за харэографа на 17 гадоў мастак меў своеасаблівы погляд на жыццё. Убачыць у мастацтве жыццё, велічнасць і боскасць Яўген Лысік дапамог і маладому балетмайстру. Разам яны яшчэ паставяць балеты «Стварэнне свету», «Ціль Уленшпігель», «Спартак» і «Шчаўкунок».

Балет «Стварэнне свету» А. Пятрова, прадстаўлены ў 1976 годзе, стаў у кар'еры харэографа адным з тых, што здарыўся насуперак усяму. У сярэдзіне 1970-х уявіць у Савецкім Саюзе Бога на сцэне было немагчыма. І, тым не менш, крэдыт даверу Елізар'еву быў такі вялікі, што балет з'явіўся.

З пастаноўкай звязана і яшчэ адна гісторыя. У тым жа годзе адбыліся гастролі беларускага тэатра ў Варшаве. Пасля «Стварэння свету» да Валянціна Мікалевіча падышоў чалавек у кардынальскай сутане і сказаў: «Дзякую вам за Бога». Гэта быў Караль Вайтыла, які пазней стане папам рымскім Іаанам Паўлам II.

Пастаўленыя Елізар'евым «Ціль Уленшпігель» Я. Глебава (1978) і «Спартак» А. Хачатурана (1980) — дзве легенды, якія апавядаюць аб мужнасці, добрым і злым, аб вечнай барацьбе. Сам балетмайстар прызнаецца, што любіць жанчын у балеце, але нельга не адзначыць асаблівую і яскравую маскуліннасць Спартака і Ціля, што чытаюцца праз іх каханне да жанчын.

У 1983 годзе мінская сцэна ўбачыла перасэнсаванне вядомай кантаты «Карміна Бурана». Вакальна-харэаграфічны спектакль быў пастаўлены балетмайстрам упершыню ў СССР на аснове кантаты нямецкага кампазітара Карла Орфа. Унікальную і запамінальную сцэнаграфію да балета стварыў Эрнст Гейдэбрэхт, які пасля вяртання Яўгена Лысіка ў Львоў стаў галоўным мастаком Вялікага тэатра Беларусі.

«Балеро» М. Равеля (1984), «Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага (1985), «Вясна свяшчэнная» І. Стравінскага (1986), «Рамэа і Джульета» С. Пракоф'ева (1988), «Дон Кіхот» Л. Мінкуса (1989) — кожны новы балет Валянцін Елізар'еў ствараў у імя мастацтва.

У 1996 годзе за харэаграфію і пастаноўку балета «Рагнеда» («Страсці») ён быў удастоены звання «Найлепшы харэограф года» і прэміі *Benois de la Danse* Міжнароднай асацыяцыі танца.

Творчая дзейнасць балетмайстра спрыяла сусветнаму прызнанню беларускага балета. Людміла Бржазоўская, Юрый Траян, Уладзімір Іваноў, Інеса Душкевіч, Таццяна Шэметавец — зоркі беларускага балета, якія атрымалі асаблівую агранку і гартаванне, трапіўшы ў арбіту таленту Валянціна Елізар'ева.

*Сцэна «О фартуна!» з балета «Карміна Бурана».*

## Вакол сусвету Елізар'ева

Падчас святочнага канцэрта ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра Ганны Маторнай гледачы мелі магчымасць убачыць на сцэне зорак беларускага балета. Народныя артысты Беларусі Ірына Яромкіна і Антон Краўчанка выканалі адажыа з балета «Спартак». Людміла Хітрова прадэманстравала Рускі танец з балета «Лебядзінае возера».

На юбілей беларускага балетмайстра прыехалі шматлікія госці з тэатраў па ўсім свеце, каб асабіста павіншаваць Валянціна Елізар'ева.

Удзельнікі ўрачыстасці ўбачылі выступленні народнага артыста Расіі Мікалая Цыскарыдзэ і Анжаліны Варанцовай (Міхайлаўскі тэатр), Алесі Расланавай і Міхаіла Яўгенава («Крамлеўскі балет»), Любові Андрэевай і Ігара Субоціна (Тэатр Барыса Эйфмана), Шугылу Адэпхан і Еркіна Рахматулаева («Астана Опера») і інш.

Сольныя выступленні прадставілі Ксенія Аўсянік (Дзяржаўны балет Берліна) і Аляксандр Магілёў, кіраўнік Рускай кампаніі сучаснага танца «ЭТО».

Аркестрам кіравалі Мікалай Калядка і Уладзімір Авадок.

Далучыўся да выступоўцаў і сам юбіляр. Падчас сцэн з балета «Шчаўкунок» Валянцін Елізар'еў прымераў капялюш Драсельмеера і атрымаў авацыі ўдзячых гледачоў і верных прыхільнікаў.

**Яна ЦЭГЛА**
**Фота Ірыны МАЛАХАВАЙ**

# Крыніца ве[illegible] і натхнення

РЭПАРТАЖ ПЯТНІЦА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Мар'інагорскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа» хутка адзначыць 85-гадо[illegible] юбілей. Гэта першая сярэдняя школа ў [illegible] Мар'іна Горка, першая, а зараз і адзіная [illegible] беларускамоўная ўстанова адукацы[illegible] сярод гарадскіх школ, дзе з'явіліс[illegible] цячага садка і створаны спецыяльны[illegible] навучання і выхавання дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Гэта сапраўдны адукацыйны [illegible] які вырашае шмат розных задач.**

Гісторыя Мар'інагорскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа цікавая і не зусім звычайная. У нашым горадзе мы вядомы як школа № 1. Але як атрымалася так, што школа № 2 ужо адзначыла стагадовы юбілей, а мы толькі на падыходзе да прыгожай даты? Пра гэтую загадку і іншыя цікавыя моманты нашай гісторыі — па парадку.

У лістападзе 1937 года ў Мар'інай Горцы адкрылася беларуская школа. Чаму ёй прысвоілі нумар адзін, а не той, які ўжо згадваўся? Справа ў тым, што з 1915 года ў Мар'інай Горцы дзейнічала школа, якая спачатку называлася земскай аднакамплектнай, пазней яна была перейменавана ў чыгуначную сямігодку. А тая, якая з'явілася 85 гадоў назад, якраз адпавядала ўсім патрабаванням аддзела народнай асветы, таму і нумарацыя школ у нашым горадзе пачынаецца менавіта ад яе. На працягу ўсяго тэрміну нашага існавання мы стараемся працаваць і вучыць так, каб ні ў вучняў, ні ў іх бацькоў, ні ў настаўнікаў, ні ў калег не заставалася сумненняў, што першая школа павінна заўсёды быць у ліку першых!

У 1937 годзе навучальная ўстанова размясцілася ў двухпавярховым цагляным будынку на вуліцы Калініна. Яна мела дзесяць вучэбных кабінетаў. Першым дырэктарам стаў настаўнік гісторыі Куксо. Матэрыяльна-тэхнічная база была вельмі сціплай, але гэта не перашкаджала тагачасным навучэнцам спяшацца туды штодзень. Дні былі напоўнены не толькі вучобай, але і цікавымі справамі. Кожную пятніцу і суботу дэманстравалі мастацкія фільмы. У школе працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці. Да кожнага свята доўга і адказна рыхтаваліся і настаўнікі, і вучні: ладзілі паказы, праводзілі літаратурныя вечарыны, танцы.

Для многіх таленавітых і адораных навучэнцаў школа стала добрым стартам у дарослае жыццё. Выпускнікі паступалі вучыцца далей, марылі стаць ваеннымі, лётчыкамі, настаўнікамі, інжынерамі, аграномамі. На выпускных вечарынах абяцалі пісаць адзін аднаму, не забываць школу і настаўнікаў, марылі, верылі ў найлепшае. Але не ўсе змаглі ажыццявіць свае абяцанні, бо Вялікая Айчынная вайна ўнесла свае карэктывы.

Да 1941 года адбылося чатыры выпускі, больш за 100 вучняў атрымалі атэстаты аб агульнай сярэдняй адукацыі. А ў хуткім часе яны ў імгненне пасталелі і зрабілі свой жыццёвы выбар. У Вялікую Айчынную вайну многія былыя настаўнікі, выпускнікі змагаліся на франтах, былі ўдзельнікамі падполля і партызанскага руху. Сваё жыццё за нашу мірную будучыню аддалі больш за дваццаць чалавек, сярод якіх — завуч школы Іван Размысловіч, настаўнікі Рыгор Шкляр, Аляксандр і Лідзія Нічыпаровічы; выпускнікі Яўген Васілеўскі (пасля школы паступіў у Таганрогскае авіяцыйнае вучылішча), Доніл Ідэльчык (вучыўся ў Ленінградскім універсітэце); вучаніца Вольга Бамбурава (была закатавана фашыстамі за сувязь з партызанамі). У час Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Мар'інай Горкі актыўную барацьбу з ворагам вяла падпольная партыйна-камсамольская група, у склад якой уваходзілі камсамольцы сярэдняй школы. Выпускнік 1941 года Уладзімір Мацкевіч, скончыўшы курсы радзістаў, быў тройчы паранены, кантужаны, але кожны раз вяртаўся ў сваю брыгаду, каб працягваць барацьбу. Ён прымаў удзел у знакамітым Парадзе Перамогі ў Маскве.

У будынку школы ў час вайны знаходзіліся нямецкія казармы. Класы на першым паверсе былі прыстасаваны для стайні. У 1942 годзе падчас адступлення ворагі падпалілі будынак, пасля чаго засталася толькі цагляная каробка. Адразу пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 годзе школа аднавіла сваю дзейнасць. Першым пасляваенным дырэктарам стала Аляксандра Якаўлеўна Жалковіч. Спачатку заняткі праходзілі ў будынках рэдакцыі мясцовай газеты і аптэкі. Частка вучняў займалася ў разбураным будынку. Навучэнцы і іх бацькі актыўна дапамагалі адбудоўваць школу — і ўжо ў 1945 годзе навучэнцы селі за парты адноўленага памяшкання. Заняткі праводзіліся ў тры змены.

Гэ[illegible] [illegible]ы. Хоць у кож[illegible] [illegible]ла ад іх было ма[illegible] [illegible]на занятках сядзець [illegible]нікаў не было. Матэрыял [illegible]х настаўнікаў, якія тыя цудам [illegible]нас. Пасля вайны ў педагагічную [illegible]уліся настаўнікі Веніямін Ізраільевіч [illegible]выкладаў фізіку), Аляксандр Васільевіч [illegible]шчук (настаўнік нямецкай мовы), Юрый На[illegible]лавіч Борд (настаўнік гісторыі). Пачалі працаваць былыя франтавікі Мікалай Аляксеевіч Цялішчаў, Барыс Мікалаевіч Прасвірын, Аляксей Аляксандравіч Хрулёў, Андрэй Міхайлавіч Юркевіч. Толькі ў пачатку 1950-х гадоў з'явіліся падручнікі, але іх зноў хапала не на ўсіх.

У 1960 годзе агульнымі намаганнямі грамадскасці, настаўнікаў, вучняў, бацькоў была пабудавана спартыўная зала плошчай 240 м². У хуткім часе з'явілася і спартыўная пляцоўка на вуліцы. З'яўленне гэтых аб'ектаў — яскрасны паварот у арганізацыі не толькі заняткаў па фізічнай культуры, але і вольнага часу вучняў. Праводзілася шмат спартыўных мерапрыемстваў, спаборніцтваў. У ліку выпускнікоў школы шмат

*Мар'інагорскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа.*

тых, для каго спорт стаў галоўнай справай жыцця. Асаблівай увагі заслугоўвае Артур Меляшкевіч. Гэты беларускі лёгкаатлет, спецыяліст па спартыўнай хадзьбе, прызёр Кубкаў свету і Еўропы, пераможца і прызёр спаборніцтваў нацыянальнага значэння, удзельнік Алімпійскіх гульняў, дзеючы рэкардсмен краіны ў хадзьбе на 20 км свае першыя крокі да вялікіх перамог зрабіў у спартыўнай зале роднай школы.

У гэты ж час з'явіліся майстэрні для працы з дрэвам і металам. Паступова школа перайшла на кабінетную сістэму навучання. Былі добра абсталяваны фізічны і хімічны кабінеты. З'явілася геаграфічная пляцоўка. Узорным было і вопытнае поле плошчай 1 га, дзе вырошчвалі вішні, яблыні, грушы, ягады. Папаўнялася матэрыяльна-тэхнічная база. Рознабаковае школьнае жыццё наладжвалася. Пачаў працаваць музей гісторыі камсамола.

Імёны дырэктараў пасляваеннай школы — Івана Барысавіча Дубінкі, Івана Васільевіча Макухіна, Аляксандра Епіфанавіча Карабцова, Віктара Сцяпанавіча Тарашкевіча, Абрама Маркавіча Геллера, Дзмітрыя Мікалаевіча Стасевіча, Тамары Ільінічны Іваніцкай — упісаны ў яе гісторыю вялікімі літаратамі, бо гэта людзі, якія прыклалі неверагодныя намаганні, каб школа не проста была, а жыла і квітнела, вучыла і выхоўвала годных грамадзян нашай краіны.

Са з'яўленнем новых школ у Мар'інай Горцы з 1967 года наша пачала называцца Сярэдняя школа № 1. Хоць колькасць навучэнцаў паменшылася, заняткі праводзіліся ў дзве змены. За гады свайго функцыянавання статус і назва ўстановы адукацыі мяняліся: у 2004 годзе школа была рэарганізавана ва ўстанову адукацыі «Дзяржаўная агульнаадукацыйная дзіцячы сад — сярэдняя школа № 1 горада Мар'іна Горка»; у 2011 годзе перайменавана ў дзяржаўную агульнаадукацыйную ўстанову «Мар'інагорскі дзіцячы сад — сярэдняя школа»; з 2012 года мы — дзяржаўная ўстанова адукацыі «Мар'інагорскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа». Але як бы мы ні зваліся, мэта дзейнасці заўсёды адна: падрыхтаваць выпускніка, які будзе займаць годнае месца ў грамадстве, атрымае прафесію, знойдзе справу па душы, прынясе карысць людзям, будзе працалюбівым, сумленным патрыётам сваёй краіны.

У 1988 годзе наша школа змяніла адрас. Пераехала ў трохпавярховы будынак на 1250 месцаў у новым мікрараёне горада — так крыніца ведаў і натхнення з'явілася на «Крыніцы». Гэта 35 вучэбных кабінетаў, сталярная і слясарная майстэрні, дзве спартыўныя, актавая залы, сталоўка, сучасны медыцынскі пункт. Цудоўна, што першы будынак школы па вуліцы Калініна захаваўся. Сёння там размяшчаецца раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Світанак». Менавіта той будынак застаецца родным для настаўнікаў, якія шмат гадоў у ім працавалі: Людмілы Бадровай, Таццяны Безукладавай, Маіны Варацілінай, Уладзіміра Гулякевіча, Наталлі Дамарацкай, Людмілы Дзяшковіч, Галіны Жур, Уладзіміра Жура, Тамары Кішко, Таісіі Круцікавай, Святланы Лапеты, Барыса Мухі, Ніны Самойленкі, Аляксандра Сарокіна, Віктара Свірыда, Зоі Свірыд, Ніны Сідаравай, Алены Федарынчык, Антаніны Федзянковай, Галіны Цяпловай, Вольгі Шастаковай, Ганны Якубчык, Таццяны Яланецкай.

Кіраўнікамі школы з гэтага часу былі Іван Іванавіч Качура, Наталля Васільеўна Пархомчык, Наталля Уладзіміраўна Дрозд.

Новае прасторнае памяшканне дазволіла наладзіць навучанне ў адну змену. У 1989 годзе працэс навучання і выхавання паступова быў пераведзены на беларускую мову.

Сёння школа жыве насычаным жыццём. Захоўваючы найлепшыя традыцыі, мы ўпэўнена крочым наперад, укараняючы найлепшыя педагагічныя наватарствы. Для сённяшніх педагогаў і вучняў ранейшымі кіраўнікамі і настаўнікамі закладзены добры падмурак для агульнага поспеху. 117 чалавек забяспечваюць адукацыйны працэс — гэта адміністрацыя, педагогі, тэхнічныя работнікі. Ва ўстанове адукацыі працуе 76 настаўнікаў і выхавальнікаў, з іх 25 маюць вышэйшую катэгорыю. Восем педагогаў з'яўляюцца выпускнікамі нашай школы.

Як і ў кожнай установе адукацыі, у нас ёсць поспехі і дасягненні ў самых разнастайных конкурсах, рэспубліканскай прадметнай алімпіядзе, даследчай дзейнасці, мастацкай самадзейнасці, спартыўных спаборніцтвах, КВЗ. Сярод нашых выпускнікоў — медалісты і тыя, хто паказаў высокія вынікі на цэнтралізаваным тэсціраванні.

Але ёсць і тое, што робіць нас адметнымі.

У 2022/2023 навучальным годзе за парты селі 633 навучэнцы, а для 67 дашкалят адчыніліся дзверы трох груп дзіцячага сада. Створаны класы для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Адзін з пасылаў, які спецыялісты нашай школы імкнуцца данесці да навучэнцаў, — мы ўсе розныя, але разам павінны стаць адзінай вялікай сям'ёй, у якой заўсёды працягнуць руку дапамогі. Каб усе ўдзельнікі адукацыйнага працэсу былі забяспечаны роўнымі правамі і магчымасцямі, створана безбар'ернае асяроддзе, на першым паверсе школы ўмацаваны рампы для перамяшчэння дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Працуе бацькоўскі клуб «Мы разам», што садзейнічае комплекснай падтрымцы бацькоў, якія выхоўваюць такіх дзяцей. На працягу трох гадоў працуе профільны лагер «Вытокі» духоўна-маральнага кірунку.

Нядаўна адбыўся выпуск адзінага ў Пухавіцкім раёне профільнага класа педагагічнага ўхілу. У мінулым навучальным годзе мы выпусцілі клас спартыўнага профілю па напрамку «футбол». У ім займалася 11 хлопцаў і трое дзяўчат.

У нашай навучальнай установе працуюць авіямадэльны і ракетамадэльны гурткі. Кіраўнік Уладзімір Пасюкоў упэўнены, што сучасным дзецям цікавы не толькі камп'ютарныя гульні, але і тэхнічнае канструяванне. У школе выдзелена асобнае памяшканне для майстэрні, дзе навучэнцы вывучаюць тэорыю авіябудавання і ракетабудавання, працуюць з чарцяжамі, канструююць уласныя мадэлі. А пасля едуць на спаборніцтвы і вяртаюцца чэмпіёнамі краіны або прызёрамі міжнародных турніраў.

Калектыў дзяржаўнай установы адукацыі «Мар'інагорскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа» складаецца з таленавітых педагогаў, якія надзелены асаблівым дарам — разгледзець таленты вучняў. Яны бачаць, хто можа стаць доктарам, настаўнікам, будаўніком, ваенным, міліцыянерам, прадпрымальнікам, спартсменам, мадэльерам, аграномам, інжынерам, і робяць усё, каб выпускнікі змаглі сябе рэалізаваць. Школа працавала і працуе для сваіх вучняў. І яны не падводзяць — знаходзяць сваё месца ў жыцці, вытокі якога пачыналіся з крыніцы на «Крыніцы».

**Вадзім КУШНЯРОЎ,**
**дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Мар'інагорскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа»**

Простыя рэчы

# Россыпы золата, срэбра і медзі

**Бывае, паэты параўноўваюць з чымсьці прыгожым то бліскучую манетку двухрублёвіка, то россыпы дробных капейчын, а то і авеяныя рамантыкай срэбныя талеры ці медныя шэлегі. Паэт Усевалад Гарачка, аўтар зборнікаў «Даты», «Пралетарскія песні», «Багі і героі», «Каляровыя слёзы», уладальнік багатай калекцыі, распавядае пра манеты не ўяўныя, а сапраўдныя, авеяныя рамантыкай гістарычных падзей.**

*Усевалад Гарачка.*

**— Усевалад, цяпер твая калекцыя займае чатыры тоўстыя альбомы. А з чаго яна пачыналася?**

— Манеты пачаў збіраць мой бацька. Былі моманты, калі ён казаў пад настрой: маўляў, мяне не стане, а ты будзеш працягваць. А бывала, хацеў мяне выпрабаваць і тады правакаваў: «Памру, а вы мае манеты разгайдамашыце!» Паслядоўным калекцыянерам ён не быў. Пачаў збіраць, будучы вучнем старэйшых класаў, потым страціў калекцыю, а калі пасля філфака ўладкаваўся настаўнікам у школу Дзяржынскага раёна, згадаў старое захапленне: ізноў пачаў абменьвацца з калекцыянерамі — назбіраў шмат медных і срэбных манет: расійскіх, польскіх, аўстра-венгерскіх, нямецкіх. Марыў пра агульную колькасць 2 тысячы, а срэбных хацеў мець 200. Мара была дасягнута… Але сябе ён называў не калекцыянерам, а збіральнікам, шукаў розныя прадметы даўніны: і медалі, і скрабкі, і каменныя сякеры.

Толькі калі бацькі не стала, ува мне абудзілася цяга да збірання манет. Пачаў зазіраць на сайты калекцыянераў, нешта набываць. Першым быў рыжскі траяк. Спачатку асабліва не арыентаваўся: браў усё, што траплялася, потым знайшліся найбольш цікавыя для мяне тэмы. Цяпер збіраю манеты Жыгімонта III Вазы: віленскія грошы, паўтаракі, познаньскія траякі і медныя соліды — так званыя «барацінкі». Быў на нашых землях авантурыст Ціт Левій Бараціні — у Вялікім Княстве Літоўскім выпушчаныя пры ім манеты былі першымі крэдытнымі. Яны існавалі ў польскай і літоўскай чаканках.

**— Цяперашні твой збор, акрамя ўласна каштоўнай калекцыі, захоўвае і памяць пра роднага чалавека…**

— Так, адзін з найдаражэйшых прадметаў у ім — знойдзеная бацькам 15-капеечная манетка часоў Кацярыны.

Кароль Жыгімонт III Ваза выпусціў па колькасці больш разнавіднасцей манет, чым усе каралі разам да і пасля яго. У мяне — акцэнт на літоўскую чаканку. Калі казаць пра манеты Яна Казіміра Вазы, сярод маіх «барацінак» ёсць каля дзясятка не апісаных, нават у самым падрабязным каталогу Цэзарыя Вольскага іх няма, не ведаю іх аналагаў і ў іншых калекцыях. Але гэта не дзіва: у абароце існавала неймавернае мноства варыянтаў. Калекцыянераў «барацінак» не так і шмат на Беларусі, але ёсць сярод іх і апантаныя, нават тыя, хто збіраецца напісаць пра гэта кнігу ці хаця б выдаць альманах.

**— Ці натхняе збіранне манет даўніх часоў на вывучэнне тых гістарычных рэалій?**

— Так, вельмі цікавы і блізкі (нават не магу сабе лагічна патлумачыць, чаму) для мяне час Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Манеты таго часу мяне цікавяць не менш. Вабіць і час Жыгімонта III Вазы: ён быў другім абраным каралём Рэчы Паспалітай, а перад гэтым некаторы час — каралём Швецыі, пакуль яму не перайшоў дарогу яго дзядзька. Спрабаваў заяваць, аднавіць у Швецыі свой трон, але з гэтага нічога не выйшла.

**— А чаму абраў для калекцыянірання тыя ці іншыя манеты?**

— Напрыклад, літоўскія грошы зацікавілі адметным знешнім дызайнам, афарменнем. А «барацінкі» інтрыгуюць: можна сустрэць штосьці невядомае сярод іх… Познаньскія траякі выклікаюць пачуццё настальгіі: бацька меў неапісаны траяк — да яго сталі прырастаць і іншыя.

**— У некаторых гістарычных фільмах ёсць сцэны, дзе манетку спрабуюць на зуб — няўжо так можна што-небудзь вызначыць?**

— Можна вызначыць, залатая манета альбо не — на зуб адчуваецца яе мяккасць.

Адметна, што фальшывыя «барацінкі» рабілі з той жа самай медзі — падробныя, яны хадзілі нароўні з афіцыйнымі. Сярод іх сустракаліся высокамастацкія, якія не саступалі, а то і пераўзыходзілі па якасцях, тэхналогіі вырабу брэсцкія ці віленскія. А некаторыя былі і прымітыўнымі.

На некаторых з фальшывых манетак зроблены двайны ўдар, відаць так званыя «заляпухі», на адваротным баку манеты — партрэт, такі самы, як і на тытульным баку, толькі ўвагнуты. Некаторыя прадаўцы робяць акцэнт на несупадзенні восей рэверса і аверса, спрабуючы на гэтым узняць кошт, называючы іх рарытэтнымі. Але рэч у тым, што на «барацінках» яны і не павінны супадаць.

У мяне ёсць і міні-калекцыя нестандартных «барацінак»: адна з манет — на кружку вельмі маленькага дыяметра, іншая — уся ў трэшчынах, наскрозь, трэцяя — бітая толькі на палове кругленькай пласціны, а іншая палова атрымалася загнутай...

Цікава, што адна з адметнасцей чаканкі — тое, што партрэты аднаго і таго ж караля, бывала, выяўляліся вельмі адвольна. Так, не ведаючы, часам складана здагадацца, што на розных манетах — адзін і той жа чалавек.

**Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ**

зваротная сувязь

# Пунсовыя ветразі лістапада

У рамках блока ранішніх праграм «У рытме дня» на канале «Культура» Беларускага радыё выходзяць праекты «Адным штрыхом» з вершамі беларускіх аўтараў, а таксама «Ранішні серыял», дзе гучыць дэтэктыў Нікалае Штэфанеску «Доўгае лета».

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе старонкі аповесці Івана Шамякіна «Палеская мадонна». У «Радыёбібліятэцы» гучыць паэма Якуба Коласа «Новая зямля» (да 140-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі). Апавяданні чакаюць слухачоў у праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных.

Для аматараў паэзіі ў перадачы «Прачулым радком» у суботу і нядзелю прагучаць вершы паэта Віктара Шніпа.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» у выхадныя складуць радыёпастаноўкі «Недаростак» па камедыі Дзяніса Фанвізіна і «Пунсовыя ветразі» паводле аднайменнай аповесці-феерыі Аляксандра Грына.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У гэтыя дні гучыць прэм'ера казкі Наталлі Бучынскай «Рыцар Квых і "жабіны вочкі"». У суботу і нядзелю ў перадачы «Дзіцячы радыётэатр» выйдуць пастаноўка «Чэмпіёны другога "В"» паводле твора Ніны Скварцовай, інсцэніраванае апавяданне Юрыя Якаўлева «Я іду за насарогам», а таксама спектакль «Туфлік Дзін» па матывах старажытных кітайскіх народных казак. Штовечар у 21.00 для маленькіх гучыць «Вячэрняя казка».

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і анонсам штотыднёвіка «ЛіМ».

У нядзелю і чацвер увазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Развагі пра літаратуру». Радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» гэтага пісьменніка, якая гучыць на «Культуры» ў нядзелю і сераду, прапануе сустрэчу з супрацоўніцай Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка Верай Ашуевай.

ЛіМ КАЛЯНДАР

**13 лістапада** — 70 гадоў з дня нараджэння Таццяны Яршовай (1952), беларускай артысткі балета, педагога, народнай артысткі Беларусі.

**13 лістапада** — 50 гадоў з дня нараджэння Настассі Масквіной (1972), беларускай артысткі оперы, педагога, народнай артысткі Беларусі.

**14 лістапада** — 75 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Капілава (1947), беларускага мастацтвазнаўца, педагога.

**15 лістапада** — 75 гадоў з дня нараджэння Анатоля Ярмоленкі (1947), беларускага эстраднага спевака, народнага артыста Беларусі.

**16 лістапада** — 85 гадоў з дня нараджэння Валянціна Лукшы (1937—2012), беларускага паэта, публіцыста, драматурга.

**18 лістапада** — 120 гадоў з дня нараджэння Міхася Машары (Міхаіла Антонавіча; 1902—1976), беларускага паэта, празаіка, драматурга, перакладчыка.

**18 лістапада** — 110 гадоў з дня нараджэння Паўла Кавалёва (1912—1995), беларускага празаіка, драматурга, перакладчыка, заслужанага работніка культуры БССР.

**19 лістапада** — 85 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Каладзінскага (1937—1997), беларускага акцёра, педагога, тэатразнаўца.

**Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ**

### Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

**11 лістапада** — на творчую сустрэчу з пісьменнікам Уладзімірам Мазго ў СШ № 101 (пр. Жукава, 27). Пачатак у 12.00.

**14 лістапада** — у публічную бібліятэку № 8 імя Максіма Багдановіча на творчую сустрэчу з паэтэсай Валянцінай Драбышэўскай. Пачатак у 12.00.

**15 лістапада** — на прэзентацыю дзіцячых кніг Уладзіміра Мазго ў СШ № 68 (зав. Ахоцкі, 17). Пачатак у 14.00.

**15 лістапада** — на творчую сустрэчу са старшынёй МГА СПБ Міхасём Пазняковым «Праз кнігу і слова да грамадзянскасці і патрыятызму» ў Міжнародным універсітэце МІТСО (вул. Казінца, 21, к.3). Пачатак у 15.00.

**15 лістапада** — у публічную бібліятэку № 7 г. Мінска на літаратурна-музычную імпрэзу, прымеркаваную да 140-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа (вул. Пляханава, 97, кор. 4). Удзел возьмуць пісьменнікі, мастакі, выкладчыкі. Пачатак у 16.00.

**19 лістапада** — у публічную бібліятэку г. Мядзела (вул. Шаранговіча, 1) на літаратурны вечар памяці паэта Міколы Шабовіча «Хто б я быў без цябе, мой бадзенеўскі кут…». Пачатак у 11.00.

### Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

**14 лістапада** — у Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (вул. Ажэшкі, 22, аўдыторыя 226) на брыфінг-канферэнцыю «Літаратурныя ўніверсітэты» з удзелам гродзенскіх паэтаў і празаікаў. Пачатак у 10.00.

**16 лістапада** — у Гродзенскую гімназію № 3 імя В. Соламавай (вул. Вольгі Соламавай, 58) на ўрок мужнасці з гродзенскімі пісьменнікамі. Пачатак у 12.30.

**17 лістапада** — у аддзел мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага (вул. Савецкая, 25) на адкрыццё выстаўкі члена СПБ, краязнаўца, калекцыянера Аляксандра Сявенкі «Эпоха СССР», прысвечанай 100-й гадавіне ўтварэння СССР. Пачатак у 16.00.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія: Таццяна Арлова, Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламедаў, Вольга Дадзіёмава, Жана Запартыка, Анатоль Казлоў, Анатоль Крэйдзіч, Віктар Кураш, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі: Юрыдычны адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны: галоўны рэдактар — 325-85-25; адказны сакратар — 377-99-73; аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98; бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы: 63856 — індывідуальны; 63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў; 638562 — ведамасны; 63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"». Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк 10.11.2022 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 729

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» ЛП1 № 02330/106 ад 30.04.2004 г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2693

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 22045